Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мін. Гарэкому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выдання—XV
№ 250 (4155)
Панядзелак, 14 верас. 1931 г.
Цана 10 кап.
БЕСПЛАТНА.

УСЕБЕЛАРУСКІ КОНКУРС НА ЛЕПШЫЯ КАЛГАСНЫЯ ФЭРМЫ

СЛУЧЧЫНА першай выканала плян камплектаваньня МТФ

ПАЛОВА ФЭРМ РАЁНУ РАЗГАРНУЛІ САЦСПАБОРНІЦТВА І ЎКЛЮЧЫЛІСЯ Ў КОНКУРС

ПРЫМАЦАВАНЬНЕМ ДА ФЭРМ ПАСТАЯННЫХ РАБОЧЫХ З ЛЕПШЫХ КАЛГАСЬНІКАЎ-УДАРНІКАЎ, СУСТРЭЧНЫМІ ПЛЯНАМІ ПА ВЫРАШЧВАНЬНІ МАЛАДНЯКА АДКАЗВАЮЦЬ НА АДОЗВУ ПАРТЫІ ПЕРАДАВЫЯ КАЛГАСЫ

„У асобе калгасных таварных фэрм знойдзена форма стварэньня аграмаджанай жывёлагадоўлі і птушніцтва, якая побач з саўгасамі найбольш хутка вырашае задачу стварэньня буйной таварнай жывёлагадоўлі“ (ЦК УсеКП(б)

Арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў--РАШАЮЧАЯ ЗАДАЧА

Апублікаваная ўчора пастанова Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б аб чарговых задачах у калгасным будаўніцтве—дакумант найвялікшай палітычнай важнасьці.

Пастанова ЦК намячае разгорнутую праграму работы для ўсіх партарганізацый.

У непрымірымай барацьбе супроць правага апартунізму, як галоўнай небясьпекі і супроць «левых» апартуністаў, КП(б)Б пад кіраўніцтвам Цэнтральнага Камітэту дасягнула гістарычных перамог у справе калгаснага будаўніцтва.

Калгаснае сялянства стала цэнтральнай фігурай зямляроблства. Сацыялістычны сэктар эскалаваў абсалютную перавагу ў сельска-гаспадарчай эканоміцы. На аснове індустрыялізацыі—гэтай «адзінай базы сацыялізму» (Ленін) тэмпы калгаснага будаўніцтва, намечаныя студзеньскім пленумам ЦК, ПЕРАВЫШАНЫ.

Цэнтральны Камітэт КП(б)Б у сваёй пастанове канстатаваў, што «пастаўленая студзеньскім пленумам ЦК задача калектывізаваць 45 проц. бядняцка-сярэдняцкіх гаспадарак да 1 студзеня 1932 г. ужо перавыканана. На 1 верасьня г. г. калектывізавана 47 проц. сялянскіх гаспадарак».

Другая большавіцкая сяўба і разгортваньне ўборачнай кампаніі зьявіліся магутнымі вагарамі далейшага росту калектывізацыі.

Такім чынам, у нашым распараджэньні ёсьць усе магчымасьці для таго, каб завяршыць у асноўным суцэльную калектывізацыю БССР да канца 1932 году, кіруючыся пры гэтым наступным растлумачэньнем ЦК УсеКП(б) аб тым, што:

«...мярыпам завяршэньня ў асноўным калектывізацыі таго ці іншага раёну або вобласьці зьяўляецца не абавязковы ахоп усіх 100 проц. бядняцка-сярэдняцкіх гаспадарак, а ўцягненьне ў калгасы ня менш 68-70 проц. сялянскіх гаспадарак з ахопам ня менш 75-80 проц. пасеўных плошчаў сялянскіх гаспадарак» (з пастановы ЦК УсеКП(б) ад 2 жніўня 1931 г.).

Шляхі далейшага разгортваньня калектывізацыі зусім ясна ўказаны Цэнтральным Камітэтам УсеКП(б) і канкретызаваны ва ўмовах БССР у пастанове ЦК КП(б)Б аб чарговых задачах калгаснага будаўніцтва.

Рашуча перасякаючы ў корані ўсякую пагоню за раздутымі процантамі калектывізацыі, ТРЭБА МАКСЫМУМ СІЛ І ЭНЭРГІІ КІНУЦЬ НА АРГАНІЗАЦЫЙНА-ГАСПАДАРЧАЕ ЎМАЦАВАНЬНЕ КАЛГАСАЎ, ПАСТАВІЦЬ УМАЦАВАНЬНЕ КАЛГАСАЎ У ЦЭНТР УВАГІ.

На вёсцы ў суадносінах клясавых сіл, у сувязі з ростам сацыялістычнага сэктару, адбыліся вялізарныя зрухі. Сацыялістычны сэктар—саўгасы і калгасы—у сельскай гаспадарцы заняў рашаючае месца.

Купак у сваёй барацьбе супроць калгаснага будаўніцтва мяняе тактыку. Раней кулацтва галоўным чынам імкнулася ўтрымаць аднаасобнікаў ад уступленьня ў калгасы. Цяпер іншая справа. Цяпер цэнтр цяжару клясавай барацьбы на вёсцы ў асноўным пераносіцца ў галіну сельска-гаспадарчага вытворства сацыялістычнага сэктару. Цяпер кулацтва імкнецца падарваць калгасы з сярэдзіны, змагаючыся за абязьлічку і ўраўніпаўку, супроць зьдзельшчыны і арганізацыі працы. Цяпер клясовы вораг—купак імкнецца падкапаць пад эканамічную магутнасьць калгасаў, затармазіць і дэзарганізаваць калгаснае вытворства.

РАШАЮЧАЙ і ВАЖНЕЙШАЙ умовай завяршэньня суцэльнай калектывізацыі БССР да канца 1932 году зьяўляецца АРГАНІЗАЦЫЙНА - ГАСПАДАРЧАЕ ЎМАЦАВАНЬНЕ КАЛГАСАЎ.

Разгарнуўшы ўпартую і настойлівую штодзённую работу па ўмацаваньні калгасаў, па выразнай арганізацыі і далейшым фарсаваным разьвіцьці калгаснага вытворства трэба замацаваць дасягнутыя посьпехі калектывізацыі. Максымум увагі, максымум сіл і энэргіі трэба сканцэнтраваць на рашаючых участках барацьбы за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў—на барацьбе за зьдзельшчыну, ацэненую ў працадні і выразны ўлік працы, за неадкладную ліквідацыю абязьлічкі і ўраўніпаўкі, за правільнае разьмеркаваньне ўраджаю і даходаў у калгасах па колькасьці і якасьці працы, затрачанай кожным калгасьнікам, па працаднёх.

Цэнтральны Камітэт КП(б)Б у сваёй пастанове з усёй сілай іменна і падкрэсьлівае неабходнасьць «згрупаваць галоўную ўвагу партарганізацый, земельна-калгасных органаў і ўсіх працаўнікоў на арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў, асабліва жывёлагадоўчых, ільнаводчых і гародных».

ЦК КП(б)Б вызначыў цэлы рад канкратных мер па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў, якое «зьяўляецца актуальнейшай і важнейшай задачай усяго калгаснага руху і ў першую чаргу для раёнаў, якія дасягнулі ўжо значных посьпехаў у калгасным руху».

ЦК абавязаў Калгасцэнтр, райкомы КП(б)Б і райвыканкомы неадкладна праверыць правядзеньне зьдзельшчыны ў калгасах, забясьпечыўшы рашучае ўкараненьне сапраўднай зьдзельшчыны, а не фармальнай, не папяровай, ва ўсіх калгасах.

Перавод на зьдзельшчыну, ацэненую ў працаднёх і выразны ўлік працы кожнага калгасьніка—важнейшыя задачы, якія павінны быць бяз усякай марудносьці, бяз усякіх адтэрмінаваньняў неадкладна ажыцьцёўлены на справе. Трэба выкараніць абязьлічку і ўраўніпаўку, якія тармозяць арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў. Трэба забясьпечыць правільнае разьмеркаваньне ўраджаю і даходаў у калгасах па колькасьці і якасьці працы, па працаднёх у поўнай адпаведнасьці з апошнімі пастановай ННК БССР і Калгасцэнтру.

Усе гэтыя задачы — укараненьне зьдзельшчыны ацэненай у працаднёх, неадкладнае выразнага ўліку працы, поўная ліквідацыя абязьлічкі і ўраўніпаўкі, правільнае разьмеркаваньне даходаў у калгасах,—павінны стаць у цэнтры ўвагі ўсёй штодзённай работы раённых арганізацый.

УЗБУЙНЕНЬНЕ часткі дробных калгасаў, улічваючы асаблівасьці былых хутарскіх раёнаў БССР, мае сур'ёзнае значэньне.

Арганізацыйна - гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў патрабуе стварэньня моцных, усебакова падрыхтаваных калгасных кадраў. Падрыхтоўка калгасных кадраў павінна стаць у парадак дня. Канкратныя мерапрыемствы, вызначаныя ў пастанове ЦК КП(б)Б па гэтым пытаньні павінны быць сваячасова і поўнасьцю праведзены ў жыцьцё.

Цэнтральны Камітэт КП(б)Б падкрэсьліў, што Наркамзем, Калгасцэнтр і райкомы партыі ў сваёй рабоце па гаспадарчым умацаваньні калгасаў у цэнтр увагі павінны паставіць разьвіцьцё жывёлагадоўлі, тэхнічных культур і гароднiцтва, усямерна дабіваючыся высокіх якасных і колькасных паказальнікаў гэтых галін сельскай гаспадаркі. Трэба забясьпечыць фарсаванае разьвіцьцё калгасных таварных фэрм і ільнаводчых калгасаў шляхам правільнай арганізацыі працы ў іх, ліквідацыі абязьлічкі і ўраўніпаўкі, шляхам разгортваньня ўнутрыкалгаснай гаспадарча-будаўнічай работы.

Вялікія задачы ў барацьбе за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў ускладняюцца на машына-трактарныя станцыі. ЦК КП(б)Б абавязаў Наркамзем, Трактарацэнтр і Калгасцэнтр «распрацаваць канкратныя прапановы па рашучым паляпшэньні работы машына-трактарных станцый». МТС павінны поўнасьцю апраўдаць сваю ролю рухавікоў суцэльнай калектывізацыі.

І так для таго, каб завяршыць суцэльную калектывізацыю БССР, трэба галоўную ўвагу сканцэнтраваць на гаспадарча-арганізацыйным умацаваньні калгасаў, рашуча перасякаючы ўсякую пагоню за раздутымі процантамі калектывізацыі. Аднак гэта зусім ня значыць, што задача далейшай арганізацыі новага калгаснага прыпіву адпадае. Толькі сьляпец, толькі махровы апартуніст можа так ставіць пытаньне. Зусім відавочна, што толькі пры штодзённай глыбокай, настойлівай і ўпартай барацьбе за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, пры адначасовым разгортваньні барацьбы за арганізацыю далейшага калгаснага прыпіву можа быць з посьпехам ажыцьцёўлена задача завяршэньня суцэльнай калектывізацыі БССР да канца 1932 года.

Гэта тым больш неабходна падкрэсьліць, што ў цэлым радзе раёнаў БССР процант калектывізацыі на сёньняшні дзень зусім ніізкі. Мы маем раёны, якія ахапілі калгасамі зусім нязначную колькасьць бядняцка-сярэдняцкіх гаспадарак (Бабруйскі, Лепельскі, Пятрыкоўскі і інш.). Такое становішча калектывізацыі ў гэтых раёнах зьяўляецца вынікам правапартуністычнай стаўкі на самацёк у пытаньнях арганізацыі новага калгаснага прыпіву і выкікам ігнараваньня гаспадарча-арганізацыйнага ўмацаваньня калгасаў, вынікам невыстарчальнай барацьбы з кулаком і яго права-«лявацкай» агентурай.

Трэба весьці самую рашучую, самую непрымірымую барацьбу з права-апартуністычнай стаўкай на самацёк, а таксама і з «левымі» перагібамі, з пагоняй за дутымі процантамі калектывізацыі.

І так задача заключаецца ў тым, каб па-большавіцку разгортваючы барацьбу за гаспадарча-арганізацыйнае ўмацаваньне калгасаў, якое зьяўляецца рашаючай і важнейшай задачай калгаснага будаўніцтва, разам з тым трэба рашуча змагацца супроць правапартуністычнай стаўкі на самацёк у пытаньнях арганізацыі новага калгаснага прыпіву.

Па-большавіцку разгорнем барацьбу за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, асабліва жывёлагадоўчых, ільнаводчых і гародных, за неадкладнае ўкараненьне зьдзельшчыны, ацэненай у працаднёх, за выразную арганізацыю і ўлік працы ў кожным калгасе, за поўную ліквідацыю абязьлічкі і ўраўніпаўкі, за правільнае разьмеркаваньне даходаў у калгасах па колькасьці і якасьці працы, затрачанай кожным калгасьнікам, па працаднёх, злучаючы гэту работу з арганізацыяй новага калгаснага прыпіву.

Руйнуючы супраціўленьне кулака, рашуча змагаючыся супроць правапартуністычнай стаўкі на самацёк і супроць «левых» загібаў,—забясьпечым новы магутны ўздым калгаснага будаўніцтва.

Пералом зроблен

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта)

У нумары ад 1-га верасьня „Зьвязда“ адзначыла, што **СЛУЧЧЫНА**, асноўны жывёлагадоўчы раён БССР, ішла міма цэнтральнай задачы пастаўленай зараз партыяй у галіне сельскай гаспадаркі—міма разгортваньня жывёлагадоўлі.

За апошнія дэкады ў Случчыне наглядаецца значны пералом у справе будаўніцтва таварных калгасных фэрм. Уся гартарганізацыя мабілізавана на рэалізацыю пастаноў партыі і ўраду аб жывёлагадоўлі.

Ва ўсебеларускі конкурс на лепшыя калгасныя фэрмы ўключылася палова ўсіх фэрм раёну.

Случчына ўжо поўнасьцю выканала плян камплектаваньня малочных таварных фэрм, у якіх ужо зараз ёсьць 1.144 штукі.

Арганізавана 10 цялячых фэрм на 960 цялят, у цялячых фэрмах ужо зараз пастаўлена 265 цялят; арганізуюцца яшчэ 4 фэрмы. Усяго ў раёне будзе 14 цялячых фэрм і 1.330 цялят. Камплектаваньне гэтых фэрм праводзіцца **за лік абагуленьня і куплі цялят** у калгасьнікаў, а таксама ў аддзяленьнях Белмяса. Пад цялятнікі прыстасоўваюцца старыя будынкі.

У раёне ўжо арганізавана 70 сьвінагадоўчых фэрм з пагалоўем у 2.700 сьвінаматак, што складае 43 проц. пляну камплектаваньня.

12 перадавых калгасаў у асноўным канчаюць камплектаваньне сьвінагадоўчых фэрм, напрыклад, **калгас „1 мая“** выканаў плян камплектаваньня на 130 процантаў, калгас **„Батрак“**—на 80 проц., калгас **„Случ“**—на 95 проц., калгас **„Камбайн“**—на 80 проц.

Па здачы малака плян выканан на 60 проц.

Пастаўлена на адкорм 960 падсьвінкаў. Калгасы „Камбайн“, „Случ“ і імя 1 мая падрыхтоўваюць да Кастрычніцкага сьвята **чырвоныя абозы з падкормленымі падсьвінкамі,** якіх яны здадуць дзяржаве.

Затое, зусім не пасунулася наперад будаўніцтва фэрм дробнай жывёлы, як птушніцкіх і трусагадоўчых. У гэтай справе ўсё яшчэ панае правапартуністычная практыка. Калгас **«Будзённавец»** ня прымае вызначаных яму трусоў. У калгасе **«Колас»** ад дрэннага догляду здохла 600 курэй. Шкодныя разважаньні супроць арганізацыі фэрм дробнай жывёлы, якія наглядаюцца ўнутры калгасаў, не сустракаюць належнага адпору з боку раённых арганізацый, калгасьнікам не растлумачана значэньне гэтых фэрм і мэтад іх арганізацыі.

Трэба адзначыць поўную бязьдзейнасьць раённага конкурснага бюро, якое ня мае ніякіх вестак аб ходзе конкурсу і фактычна ім ня кіруе.

Арцельны.

Абмалот ільну.

Жывёлагадоўля—ня стала цэнтральнай задачай

ПОЛАЦАК. (Наш кар.). 2.800 прадукцыйных кароў — вось праграма разгортваньня жывёлагадоўлі ў малочных таварных фэрмах. Але як раённыя арганізацыі, так і праўленьні калгасаў не паставілі для сябе цэнтральнай задачай камплектаваньне і арганізацыю малочных таварных фэрм. **Замест 2.800 кароў на фэрмах сканцэнтравана толькі 1.944.**

Вельмі дрэнна ідзе і здача таварнай прадукцыі дзяржаве. Фэрмы здалі толькі 275 цэнтнэраў малака, што складае 1,33 проц. вызначанай лічбы.

Скотныя двары—бясспрытульныя

Калгас **«КАСТРЫЧНІЦКАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ»** (Менщчына) мае жывёлагадоўчы ўхіл. Ня гледзячы на гэта, скотныя двары ў калгасе — бясспрытульныя. Праўленьне імі зусім ня цікавіцца. На скотныя двары вылучаюць самых адсталых калгасьнікаў. Уліку ўдоя не вядзецца. Гэта спрыяе разбазарваньню малака і ўсякім злоўжываньням. Калгасьнікі, якія працуюць на фэрме, поюць малаком сваіх уласных сьвіней. На скотным дварэ шмат брудаў: каровы стаяць па калені ў гнаі. Жывёлавод Філіпава вельмі дрэнна даглядае жывёлу і сваімі паводзінамі паказвае дрэнны прыклад іншым калгасьнікам. Ц.

Саўгасу „Хальч“

патрэбна дапамога раённых арганізацый

ЖЛОБІН. Будаўніцтва сьвінарнікаў у саўгасе **«ХАЛЬЧ»**, Жлобінскага раёну, ідзе марудным тэмпамі з-за недахвату рабочай сілы.

На пабудове павінна было працаваць 150 чал., а працуе толькі 22, на будаўніцтве наглядаецца цякучасьць рабочых. Ніякай дапамогі новаму саўгасу.

Аддзяленьне Белмяса зрывае ўкамплектаваньне саўгасу Рымні

Саўгас **«РЫМНІ»** — адзіная савецкая гаспадарка ў Капыльскім раёне. Да кастрычніка саўгас трэба ўкамплектаваць яшчэ 330 сьвінаматкамі. Для гэтага заключан дагавор на 110 сьвінаматак з Случкім аддзяленьнем Белмяса. У ліпеню павінна было паступіць 10, у жніўні —40 і ў верасьні 30. Трэскі райкалгасаў павінен быў здаць згодна заключанага дагавору 100 штук і Капыльскі —120.

Дагавор гэты ня выконваецца.

Малако асядае ў калгасах

На фэрмы пасылаюць інвалідаў

Бабруйскі раён — адзін з асноўных жывёлагадоўчых раёнаў. У раёне ўжо арганізаваны 23 малочныя таварныя калгасныя фэрмы. Але плян камплектаваньня гэтых фэрм выконваецца вельмі марудна. **Замест 2.957 кароў на фэрмах ёсьць толькі 1.437, г. зн. плян камплектаваньня выканан толькі ў разьмеры 48 процантаў.**

Дзе-ж прычыны такіх ганебных тэмпаў? Па-першае, трэба падкрэсьліць **бязьдзейнасьць райкалгассаюзу.** Апошні дагэтуль яшчэ не заключыў дагавору з аддзяленьнем Белмяса аб забесьпячэньні МТФ прадукцыйнай рагатай жывёлай.

Нічога ня зроблена для арганізацыі ўкамплектаваньня фэрм за лік уласных рэсурсаў калгасьнікаў. Нарэшце, жывёлагадоўчыя калгасы невыстарчальна забясьпечаны крэдытамі на набыцьцё жывёлы.

Загадчыкі МТФ, як правіла, **не адчуваюць адказнасьці за камплектаваньне фэрм, за забесьпячэньне іх кармамі.**

Будынкі фэрм яшчэ дрэнна абсталяваны, слаба разгорнута будаўніцтва скотных двароў і цялятнікаў.

Праца на фэрмах яшчэ не арганізавана як належыць. Фэрмы дагэтуль ня маюць пастаянна прымацаваных брыгад па доглядзе жывёлы, па даеньні кароў і г. д.

Замест прыкладных і лепшых калгасьнікаў праўленьні калгасаў часта **пасылаюць на фэрмы інвалідаў, якія ня здольны як належыць даглядаць жывёлу.**

Фэрмы павінны здаць дзяржаве 3.000 цэнтнэраў малака, **здана-ж усяго 150 цэнтнэраў. Большасьць малака асядае ў саміх калгасах і не даходзіць да прыёмных пунктаў.** І ня дзіва, бо на радзе фэрм нават **НЕ ВЯДЗЕЦЦА ЎЛІКУ ЎДОЮ.**

Усё гэта паказвае, што ў кіраўніцтве малочна-таварнымі фэрмамі панае поўная абязьлічка і самацёк. Райкалгассаюз яшчэ не арганізаваў штодзённага нагляду за становішчам фэрм, ходам будаўніцтва ў іх і забесьпячэньня іх кармамі. Такога кіраўніцтва далей нельга цярпець.

Ф. Х.

Плян камплектаваньня ня выканан

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.). Камплектаваньне малочных калгасных эрфм па раёне праходзіць вельмі нездавальняюча. Ні адна фэрма яшчэ ня выканала пляну камплектаваньня. Так, фэрма калгасу **імя 1-га мая** павінна мець 100 кароў. На сёньняшні дзень ёсьць толькі 20. Калгас **«Чырвоны спаборнік»** замест 150 кароў мае на фэрме толькі 57. У калгасе **«Сацыяліст»** замест 125 кароў ёсьць 34.

Толькі некаторыя калгасы, як **«Кемінтэрн», «Саха і молот» і «Непераможны»** выканалі плян камплектаваньня ад 88 да 93 проц.

Зусім дрэнна разгортваецца будаўніцтва абор. Толькі калгасы **«Чырвоны Сормавец» і «Колас»** выканалі будаўніцтва ў 95 проц., большасьць жывёлагадоўчых калгасаў будаўніцтва абор яшчэ не пачыналі або выканалі яго ўсяго ў разьмеры 5-10 проц.

П.

Дапамагчы калгуне імя Сталіна

ШУМЛІНА. (Па тэлеграфу). Камуна імя Сталіна — буйнейшая ў Сіроцінскім раёне. У камуне ідзе будаўніцтва аборы на 100 шт. жывёлы. Калгасьнікі парашылі крыць абору саломай, але не хапае крыху цьвікоў для прыбіўкі лат.

Райкалгассаюз не аказвае калгасу ніякай дапамогі і зусім ня кіруе будаўніцтвам у жывёлагадоўчых таварных фэрмах.

Тэхкультуры

МТС павінны паказаць прыклад

баявой уборкі канапель

Падцягнуць слабыя вучасткі

Паскорыць тэмпы апрацоўкі ільну

Машына-трактарныя станцыі БССР у пераважнай сваёй большасьці з посьпехам скончылі церабленьне ільну. На 10 верасьня калгасы МТС убралі 41.549 гэкт. ільну замест пляну ў 41. 494 гэкт. — 100,1 проц. Плян перавыкананы за кошт абагуленых пасеваў ільну новаўступіўшых калгасьнікаў.

Усё-ж некалькі МТС ня выкачалі цалкам сваіх плянаў. У глыбокім тыле знаходзіцца **Расонская** МТС, якая выцерабіла толькі 77,9 проц. Адстаюць яшчэ **Аршанская**, якая выцерабіла 90,6 проц. **Менская** — 91,1 проц. **Асьвейская** — 92,6 проц. **Ветрынская** — 95,1 проц. і **Баркавіцкая** — 95, 7 проц.

Аднак першапачатковая апрацоўка ільну разгортваецца павольна. З 41.549 гэкт. выцерабленага ільну абмалочана і разаслана толькі палова 21.076 гэкт. Паднята са сьцеліч раньняга ільну 1.368 гэкт.

Калі з церабленьнем ільну большасьць МТС справілася па-баявому, дык з уборкай канапель мы маем зусім адваротнае. У калгасах МТС засеяна 2. 322 гэкт. канапель, убрана на 10-га верасьня толькі 244 гэкт — 10,5 проц.

23 МТС яшчэ не прыступілі да ўборкі канапель. З МТС, якія прыступілі да ўборкі, некаторыя выкалалі плян у зусім мінімальным разьмеры. Напрыклад **Заслаўская** МТС выканала ўборку канапель на 1,3 проц. **Лепельская** — на 8,4 проц.

Між тым, частка МТС, якія правільна расставілі сілы ў калгасах, — набліжаюцца да завяршэньня ўборкі канапель. Так **Гарадоцкая** МТС плян па ўборцы канапель выканала і перавыкапала на 133 проц. Набліжаюцца да выкананьня **Танеская** МТС — 98,5 проц., **Жыткавіцкая** 92,2 проц.

Задача МТС — пераключыць усе сілы калгасьнікаў на завяршэньне абмалоту і расцілу ільну і скончэньне ўборкі канапель у найкарацейшы тэрмін. Нельга цярпець такога становішча, калі паасобныя МТС цягнуцца ў глыбокім тыле ўборкі.

Ільнацерабілка Шахаўскай МТС за работай.

Усебеларуская нарада па ільнаводзтве і жывёлагадоўлі

ВІЦЕБСК. (Па тэлеграфу ад наш. спец. кар.). 12-га верасьня пачала работу Усебеларуская нарада па ільнаводзтве і жывёлагадоўлі. Нарада займаецца вырашэньнем канкрэтных мерапрыемстваў па выкананьні пляну разьвіцьця сацыялістычнай жывёлагадоўлі і забесьпячэньня сваячасовай уборкі і апрацоўкі ільну. На нараду прыбылі прадстаўнікі 17 раёнаў.

Перасьпелыя канаплі не убіраюцца

СЛУЦАК. (Наш кар.). У раёне засеяна 30 гэкт. канаплямі. Значная частка канапель ужо перасьпела, а ў паасобных выпадках нават перасьпела, аднак з уборкай іх не спяшаюцца. Ніводнага гэктару на сёньняшні дзень ня ўбрана.

Слуцкія „очковтиратели“

СЛУЦАК, 10. (Наш спец. кар.). Калі меркаваць па зводках слуцкага райза, дык уборка ільну ўжо скончана, аднак ў сапраўднасьці мы маем зусім адваротнае.

У калгасе **імя К. Маркса** стаіць на корані 6 гэкт. ільну і 11 гэкт. ляжыць і гніе на полі. Такое-ж становішча ў калгасе **«Ботвін»** і **«КІМ»**. Гэтыя калгасы «втирают очки», што ў іх уборка скончана. У сваю чаргу раённая земельная частка таксама не застаецца ў даўгу; яна дае зводку НКЗ, што уборка ільну скончана. Раённая земельная камісія ўтойвае сапраўднае становішча з уборкай ільну. Усе раённыя арганізацыі ведаюць, што памянёныя калгасы ня скончылі ўборкі ільну.

Трэба моцна ўдарыць па тых, хто замест выяўленьня недахопаў уборкі і бальшавіцкай барацьбы з імі, займаюцца «очковтирательством». Органы РСІ павінны расьсьледаваць гэты факт. **А.**

З пасеўнага фронту

АРШАНСКАЯ, КЛІМАВІЦКАЯ, КАСЬЦЮКОВІЦКАЯ І МСЬЦІСЛАЎСКАЯ МТС

ЗАКОНЧЫЛІ СЯЎБУ

Неадкладна пераключыць свабодную цягавую сілу на зяблева і ўздым цаліны

10 верасьня сяўба азімых павінна была скончыцца. МТС павінны былі паказаць прыклад большавіцкай арганізаванасьці, яны павінны былі зламаць векавыя традыцыі: «пачынаць сяўбу толькі пасьля» «прачастай».

На 10 верасьня кагасы, якія абслугоўваюцца МТС, засеялі 71.123 гэктары — 60,1 проц. Тэмпы сяўбы нарастаюць марудна.

Толькі 4 МТС выканалі і перавыканалі планы сяўбы.

Аршанская выканала плян сяўбы на 138,8 проц. **Клімавіцкая** —на 114,7 проц., **Касьцюковіцкая** 104,9 проц. і **Мсьціслаўская**—104,3 проц. Прыклад гэтых МТС паказвае, што пры належнай мабілізацыі мас калгасьнікаў, планы сяўбы можна ня толькі выканаць, але і перавыканаць.

На жаль большасьць МТС гэтага не зрабілі, не мабілізавалі калгасных мас, не расставілі сваіх сіл так, каб злучыць скончэньне ўборкі ўраджаю з адначасовым разгортваньнем сяўбы. Чаго варты такія тэмпы, якія паказваюць некаторыя МТС. Напрыклад, **Рагачоўская**, якая выканала плян сяўбы на 6,5 проц., **Жыткавіцкая** —на 4 проц., **Стара-Дарожская** на 8,8 проц. **Церахоўская** — 26,1 проц., **Расонская** — 30,7 проц. **Сіроцінская**—на 32,7 проц.

Дрэнна справа з зяблевам. Згодна каляндарнага плану НКЗБ, на 10 верасьня павінна быць узьнята 37 проц. зябі. Гэта дырэктыва шмат чаму абавязвае і МТС. На 10 верасьня МТС узьнялі 26.109 гэкт. зябі — 10 проц. Апошняя дэкада дала прырост толькі 4,1 проц.

Рад кіраўнікоў МТС ігнаруюць зяблева і не пераключылі 80 проц. трактарнага парку і 25 проц. конскай цягавай сілы на гэтае мерапрыемства. Ня дзіва, што ўздым зяблева ў гэтых МТС амаль ня зрушыўся з месца за пяцідзёўку (з 5 па 10 верасьня). Напрыклад, **Рагачоўская** МТС мела на 5 верасьня ўзьнятай зябі 1,3 проц., а на 10 верасьня — 1,7 проц., **Расонская** — аднаведна гэтаму — 2,2 проц. і 2,5 проц., **Заслаўская** — 2,8 і 3,5 проц.

Нікуды ня варта справа з уздымам цаліны. Са 110.600 гэкт. МТС узьнялі толькі 3.672 гэкт. цаліны. 12 МТС: **Заслаўская, Асьвейская, Шклоўская, Слуцкая, Клімавіцкая, Горацкая, Мсьціслаўская, Дубровенская, Расонская, Касьцюковіцкая, Баркавіцкая і Магілеўская** нават яго пачыналі ворыва цаліны.

Патрэбна мабілізаваць масы калгасьнікаў на хутчэйшае скончэньне асеньняй сяўбы, правільна расставіць сілы, не дапускаць прастояў цэлымі днямі трактараў як гэта ёсьць у СтараДарожскай МТС. Перакінуць 80 проц. трактатараў на зяблева. МТС, павінны зьвярнуць асаблівую ўвагу на ўздым цаліны. Трактары павінны быць кінуты на гэты фронт, а конская цягавая сіла — на ўздым асвоеных зямель.

25 проц. азімага кліну засеяна

ДУБРОЎНА. (Наш кар).) Калгас **«Чырвоны сьцяг» Ростканўскага** сельсавету налічвае 45 гаспадарак. Калгас вылучыў 38 калгасьнікаў адыходнікаў.

Расстаўіўшы правільна наяўную сілу калгас скончыў уборку яравых. З 62 гэкт. ільну ўбрана на 3-га верасьня 59 гэкт. Большая частка рабочай сілы кінута на абмалот ільну. Калгас з 60 гэкт. засеяў 10 гэкт. азімых. **Слуцкін.**

Сяўба скончана

ПУХАВІЧЫ. Дзякуючы ўвядзеньню зьдзельшчыны і правільнай расстаноўцы сіл камуна **«Зьвязда»** 4-га верасьня скончыла ўборку аўса.

Сяўба азімых скончана 8-га верасьня. Таксама камуна пасьняхова закончыла абмалот ільну і ільнасемя здала ў кампэрацыю. **М. Трушко.**

Прамова т. Гея на пленуме ЦСПСБ

У выступленьні тав. Сталіна на нарадзе гаспадарнікаў дана па сутнасьці праграма работы ня толькі гаспадарчых органаў, але і прафсаюзаў. Ад таго, наколькі хутка ўказаньні тав. Сталіна будуць ажыцьцёўлены ў практыцы работы гаспадарнікаў, партыйных і прафсаюзных арганізацый, у практыцы работы ўсяго трыкутніка, залежыць выкананьне пляну трэцяга рашаючага году. Найбольш небясьпечным зьяўляецца тое, што ў нас прывыклі да прарываў. Многія гаспадарнікі і прафарганізацыі прывыклі да таго, што пляны ня выконваюцца і лічаць, што 85 проц. выкананьня пляну ўжо даволі. З гэтымі настроямі трэба рашуча пакончыць. Гэта ёсьць чысьцейшай вады правы апартунізм.

Адно з двух — або трэба сказаць, што нашы пляны нерэальныя, што мы ня можам іх выканаць, або калі пляны рэальныя, а іх у поўнай меры можна выканаць і яны рэальныя, давайце іх выконваць на ўсе 100 проц. і ня менш.

Як дабіцца стопроцэнтнага выкананьня пляну?

Шлях да гэтага ўказан у выступленьні тав. Сталіна на нарадзе гаспадарнікаў. У адпаведнасьці з гэтым выступленьнем складзены вашы рэзалюцыі. Застаецца правесьці ў жыцьцё добрую рэзалюцыю, па сутнасьці гэта гапоўнае. У нас з правядзеньнем у жыцьцё праграмнага выступленьня тав. Сталіна справа стаіць нядобра. Рэзалюцыі пішуцца прыгожыя, а на справе атрымліваецца інакш. Возьмем хаця-б пытаньне аб ураўнілаўцы. Будучы на Асінторфе, я даведаўся, што існуе цыркуляр Белторфу і ЦП саюзу, каб не дапускаць увядзеньня дыфэрэнцыацыі зарплаты на торфамашынах. Як вам вядома, пры машыннай здабычы торфу найбольш цяжкай зьяўляецца работа ў кар'ерах, дзе прыходзіцца выкопваць рыдлёўкай; іншыя работы параўнальна лягчэйшыя. Мы не забясьпечылі кар'ерных рабочых лепшай зарплатай, а калі зрабілі спробу павялічыць іх зарплату, дык атрымліваецца ад Белторфу і ЦП саюзу цыркуляр: «не прабуйце, не праводзьце, каніцце, як было».

Або ўзяць другі прыклад з галіны камунальных работ. Для каменшчыкаў-мастаўшчыкоў існуе зьдзельшчына нормы і расцэнкі, а атрымліваецца, што арцель атрымлівае за ўсіх рабочых і дзеліць зарплату пароўні, такім чынам уся наша тарыфная палітыка ідзе пабоку. Арцель каменшчыкаў-мастаўшчыкоў уводзіць сваю тарыфную палітыку, якая нічога ня мае супольнага з палітыкай партыі. Паўстае пытаньне, чаму-ж таварышы-прафсаюзьнікі бачылі гэтыя арцельныя агіднасьці, не сыгналізавалі аб іх, не змагаліся з імі? І таксама ў нас на прадпрыемствах ня толькі ў такіх адсталых галінах прамысловасьці, як торф і будаўніцтва, — гэта параўнальна новыя галіны прамысловасьці, але і на прадпрыемствах больш старых.

У тарыфнай палітыцы ў нас шмат яшчэ засталося ад старога кіраўніцтва ВсеЦСПС на чале з тав. Томскім, якое праводзіла ўраўнілаўку, прыкрываючыся прыгожымі разважаньнямі аб тым, што трэба падцягнуць адсталыя катэгорыі. І падцягнулі гэтыя адсталыя катэгорыі так, што падмятальшчык атрымлівае нароўні з токарам вышэйшай рукі і, вядома, яму няма сэнсу кваліфікавацца, калі яго зарплата застанецца ранейшай. Тарыфна-нармовачная палітыка старога кіраўніцтва ВсеЦСПС не прайшла бясьследна для саюзаў, і папрацаваць вам над гэтым прыдзецца больш, чым здаецца на першы погляд. Барацьба супроць ураўнілаўкі будзе больш цяжкай, чым вы думаеце, бо карэньні яе ўсялі давоўі глыбока, у некаторых выпадках прыдзецца перамагаць супраціўленьне адсталых груп рабочых. Таму асноўная наша задача заключаецца ў тым, каб вашы прыгожа напісаныя рэзалюцыі не засталіся на паперы, і каб нашы прафработнікі паставілі работу так, каб рэзалюцыя не прыстасоўвалася да жыцьця, а каб жыцьцё будаваць так, як напісана ў рэзалюцыі.

Пытаньне аб кадрах для прамысловасьці і гаспадарчым разрахунку. У гэтых пытаньнях мы маем пэўную пасьўнасьць гаспадарнікаў.

Правядзеньне гаспадарчага разрахунку сустрэла ў першыя часы супраціўленьне з боку гаспадарнікаў. «Гэта, моў, усё банк выдумаў, прафсаюзы і партыя нас у прыўду не дадуць» і г. д. Па такіх апартуністычных і абывательскага парадку настроях з боку гаспадарнікаў трэба было біць. Але трэба адзначыць, што недавацэнка значэньня гаспадарчага разрахунку, неабыстарчальна шпарная перабудова ёсьць і з боку прафсаюзаў. Такое-ж становішча мы маем і ў пытаньнях аб кадрах для прамысловасьці.

Будуюцца новыя заводы, гаспадарнікі (разам з прафсаюзамі) чакаюць, пакуль рабочыя самі прыдуць або Наркампрацы прыгоніць 8 або 9 тысяч чалавек рабочай сілы замест таго, каб шырока паставіць пытаньне аб падрыхтоўцы рабочай сілы і мабілізаваць грамадзкасьць вакол прытоку і замацаваньня рабочых. Трэба падрыхтаваць кадры, трэба заключыць дагавары з калгасамі, трэба забясьпечыць перакваліфікацыю рабочых, якія ёсьць на заводах, трэба адкрыць для рабочых магчымасьць прасоўваньня ўверх, магчымасьць павышэньня іх кваліфікацыі, і тады рабочыя будуць заставацца на заводах.

Мысьль тав. Сталіна заключаецца ў тым, што трэба арганізаваць прыток рабочых з калгасаў на прадпрыемствы. Калгасы не выкарыстоўваюць поўнасьцю сваёй рабочай сілы; у калгасах ёсьць ня менш 20 проц. лішняй рабочай сілы, але гэта лішняя рабочая сіла ня імкнецца ў горад. Наша задача заключаецца ў тым, каб максымальна ўзьняць прадукцыйнасьць працы ў калгасах і тую частку калгасьнікаў, якая вызваліцца, прыняць у горад. Гэта задача ня простая; бяз новых форм шэфскай работы прафсаюзаў над вёскай мы гэтай задачы ня вырашым. Наркампрацы ня справіцца з гэтай справай. Каб забясьпечыць прыток рабочых з калгасаў на прадпрыемствы, прафсаюзы павінны ўзяць ініцыятыву ў свае рукі, дапамагчы гаспадарнікам і папрацаваць як належыць над гэтым пытаньнем.

Праблема кадраў для прамысловасьці цесна зьвязана з пытаньнем аб рабочым забясьпячэньні і рабоце спажывецкай кааперацыі. Гэта, таварышы, важная палітычная і гаспадарчая пытаньне. Кожны з нас павінен разумець, што выкананьне прамфінпляну не ў малай ступені залежыць ад таго, як мы накормім рабочага.

Мы ня можам працаваць старымі мэтадамі, мы павінны працаваць новымі сацыялістычнымі мэтадамі — ударніцтвам, сацспаборніцтвам, арганізаваць работу, але і пры сацыялістычных мэтадах работы ёсьці трэба і ёсьці ня горш, а лепш, чым раней. Цяпер надзвычай пашыран погляд, які малюе работу кааперацыі ў адных чорных фарбах.

Вядома, кааперацыя працуе вельмі дрэнна, але калі мы будзем паяць кааперацыю, а самі ня возьмемся за справу рабочага забясьпячэньня, дык з гэтага нічога ня выйдзе. Трэба паяць кааперацыю і ўказваць на промахі, якія ёсьць але трэба і дапамагчы кааперацыі перабудавацца. Нельга агулам разглядаць усю спажывецкую кааперацыю скрозь, як гнілое месца, трэба знаходзіць здаровыя элементы ў кааперацыі і падтрымліваць іх усёй пралетарскай грамадзкасьцю. Такія элементы ёсьць, яны змагаюцца за новыя мэтады работы, яны павінны мець упэўненасьць, што ад рабочай грамадзкасьці яны атрымаюць сапраўднае падтрыманьне. Зараз большая частка забясьпячэньня рабочых перакладзена на плечы ЗРК.

ЗРК прыступілі да работы ў вельмі цяжкіх умовах. Я думаю, што я не памылюся, калі скажу, што старая сыстэма ЦРК тармазіла разьвіцьцё ЗРК, супраціўляючыся перабудове, затрымліваючы выпучэньне матар'яльных рэсурсаў, сродкаў і г. д. ЗРК былі пастаўлены ў вельмі дрэнныя ўмовы. Ці сыгналізавалі нам прафсаюзы аб такім стане рэчаў? Не сыгналізавалі. Мы мелі сыгналы па розных лініях, але не ад прафсаюзаў. Аб тым, што ЗРК трэба дапамагчы, што ў ЗРК справа паставлена дрэнна, што патрэбен шырокі кантроль, — мы не ад прафсаюзаў даведаліся. Не прафсаюзы гэтае пытаньне паставілі. Ад таго, як прафсаюзы будуць змагацца за правядзеньне тых ці іншых мерапрыемстваў, нікаравацца на павышэньне прадукцыйнасьці працы, будзе залежаць выкананьне нашых пляноў.

Трэба ізначткова выжыць спадчыну старога кіраўніцтва прафсаюзаў, якое на словах пічыла, што прадукцыйнасьць працы, вядома, павысіць трэба, але нічога для гэтага не рабіла. Трэба як напежыць узяцца за справу рабочага забясьпячэньня, увесьці пляпішэньне ў гэту справу, прыцягнуць увагу партыі да слабых момантаў работы кааперацыі. Гэта будзе рэальная практычная работа сапраўдная барацьба за выкананьне прамфінпляну, за павышэньне прадукцыйнасьці працы.

У заключэньне некалькі слоў аб падрыхтоўцы да надыходзячага гаспадарчага году — аб складаньні кантрольных лічбаў, аб высоўваньні бустрэчных пляноў. Установа партыі такая, што колькасныя заданьні па прадпрыемствах зараз, у пэрыяд складаньня кантрольных лічбаў, не прапрацоўваюцца, а ўся масавая работа з рабочымі сканцэнтроўваецца зараз на якасных паказальніках работы. Тая акапічнасьць, што ў нас выкананэ зьніжэньне сабекошту на 0,4 проц. замест 8 проц., якія мы павінны былі выканаць, — гэта ганебна, гэта горш, чым 85 проц. выкананьня прамфінпляну, і таму нашу масавую работу мы павінны разгарнуць вакол павышэньня якасных паказальнікаў.

Такі стан рэчаў ня можа не адбіцца на тэмпах разьвіцьця прамысловасьці БССР. Сродкі для капітальных укладаньняў чэрпаюцца за рахунак зьніжэньня сабекошту, за рахунак накапленьня прамысловасьці. Прамысловасьць, якая зьнізіла сабекошт на 0,4 проц., ня выканала пляну накапленьняў, — ня можа выканаць у выніку гэтага пляну капітальных укладаньняў.

Мы павінны ў бліжэйшы час у практычнай рабоце прафсаюзаў завастрыць увагу на павышэньні якасных паказальнікаў, зьніжэньні сабекошту, зьмяншэньні браку, паляпшэньні якасьці прадукцыі, павышэньні прадукцыйнасьці працы. Тут трэба правесьці цэлы рад канкрэтных мерапрыемстваў. У прыватнасьці, трэба шырока разгарнуць работу вытворчых нарад, аб якіх вельмі часта забываюць. Вось, здаецца мне, асноўнае, над чым трэба будзе папрацаваць.

Асноўнае ў нашай рабоце — гэта правядзеньне пастаноў партыі ў жыцьцё, і я спадзяюся, што прысутныя тут таварышы прымуць усе меры да таго, каб правесьці ў жыцьцё пастановы свайго пленуму і той дагавор, які вы заключылі з Заходняй вобласьцю на сацспаборніцтва. (Бурныя воплескі).

АБ ВЫНІКАХ МІЖРАЕННЫХ НАРАД ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА НОВАГА НАВУЧАЛЬНАГА ГОДУ

Заслухаўшы даклад аб выніках міжраённых нарад па падрыхтоўцы да новага навучальнага году, ЦК КП(б)Б пастанаўляе:

ПАСТАНОВА ЦК КП(б)Б

1.

Адзначыць, што пастанова ЦК КП(б)Б ад 1 жніўня 1931 году аб падрыхтоўцы да новага навучальнага году належнага адбітку ў рабоце мясцовых арганізацый не знайшла. Значная частка гаркомаў і райкомаў КП(б)Б не забясьпечыла сыстэматычнага кіраўніцтва справай культурнага будаўніцтва і правядзеньня падрыхтоўкі да новага навучальнага году, як баявой палітычнай кампаніі. Камсамол, які зьяўляецца шэфам усесаюзнага навучаньня, дрэнна выконвае свае шэфскія абавязкі і ў прыватнасьці ня выканаў пастановы ЦК аб мабілізацыі тысячы ў педустановы. Райвыканкомы і гарсаветы не аддавалі патрэбнай увагі падрыхтоўцы да навучальнага году і зусім слаба кіравалі ёю. Прафсаюзныя арганізацыі ў радзе пралетарскіх цэнтраў (Віцебск, Магілеў, Менск) не правялі неабходнай увагі да гэтага пытаньня. Рад гаспадарчых, у прыватнасьці, кааперацыйных арганізацый, ня гледзячы на пастанову ЦК, да гэтага часу ігнаруюць задачу падрыхтоўкі да навучальнага году. Органы нарасьветы не змаглі стаць на чале ініцыятывы і самадзейнасьці мас і накіраваць іх на рашаючыя пункты культурнага будаўніцтва.

Усё гэта прывяло да таго, што да пачатку навучальнага году ёсьць рад буйнейшых прарываў (асабліва ў галіне школьнага будаўніцтва і матар'яльнага забясьпячэньня вучняў). Наяўнасьць гэтых прарываў патрабуе ад мясцовых партыйных арганізацый і ўсёй пралетарскай грамадзкасьці напружанай работы, каб забясьпечыць поўнае выкананьне задач, што вызначаны пастановай ЦК ад 1 жніўня 1931 году. ЦК прапануе бюро гаркомаў і райкомаў на сваіх чарговых пасяджэньнях заслухаць даклад аб выніках падрыхтоўкі да навучальнага году і ўжыць рашучыя захады, каб на-халу ліквідаваць прарывы, якія ёсьць. ЦК лічыць неабходным папярэдзіць супроць усякіх спроб адкладваць пачатак заняткаў у школах, лікбупунктах і навучальных установах пад прадлогам прарываў у падрыхтоўцы да навучальнага году.

2.

Асноўнай задачай, без выкананьня якой немагчыма ажыцьцёўленьне вялізарных задач культурнага будаўніцтва, што перад намі стаяць, зьяўляецца ўдым на вышэйшую ступень культурнага паходу з мэтай яшчэ большага ўцягненьня працоўных мас у практычную работу па культурным будаўніцтве. Асноўным мэтадам для таго, каб выканаць гэтую задачу, мабілізаваць шырокія масы, рацыянальна скарыстаць іх актыўнасьць і зьнішчыць паралелізм, які існуе ў культурнай рабоце, зьяўляецца стварэньне адзінага культурнага пляну.

Адначасова ЦК лічыць неабходным папярэдзіць супроць такога разуменьня адзінага культурнага пляну, якое ў укой-ды там ні было меры звужвала ініцыятыву і здмывала адказнасьць з па асобных устаноў і арганізацый.

3.

ЦК ставіць перад НКА, ЦП працасьветы і ўсімі арганізацыямі, якія вядуць культурную работу па падрыхтоўцы кадраў, задачу — неадкладна распрадаваць мерапрыемствы па рэалізацыі ва ўсёй сыстэме культурнага будаўніцтва указаньняў, якія даны тав. Сталіным у яго апошняй прамове (у прыватнасьці аб зьнішчэньні ўраўнілаўкі, абязьлічкі, цякучасьці рабочай сілы, аб адносінах да інтэлігенцыі і г. д.).

4.

Адзначаючы, што пры сучаснай структуры мясцовых органаў нарасьветы яны не забясьпечваюць выразнага правядзеньня задач, пастаўленых партыяй у галіне культурнага будаўніцтва, ЦК лічыць неабходным неадкладнае стварэньне гарадзкіх і раённых аддзелаў народнай асьветы і ўкамплектаваньне іх бальшавіцка вытрымаными работнікамі. ЦК патрабуе спыненьня пастаяннага адрыву інспэктароў нарасьветы на розныя роду кампаніі, што робіць вусім немагчымым кіраўніцтва культурнай работай у раёне.

5.

ЦК канстатуе, што побач з агульным паляпшэньнем матар'яльнага і прававога становішча настаўнікаў у радзе раёнаў пастановы партыі і ўраду па гэтым пытаньні злачынна ня выконваюцца (затрыманьне зарплаты, няўдзячна норм рабочага забясьпячэньня, масавыя перакідкі настаўнікаў, шальмаваньне настаўнікаў, якія дапусьцілі асобныя памылкі і г. д.). ЦК указвае, што такія адносіны да настаўніцтва граюць на руку клясаваму ворагу і прапануе канкрэтных вінаватых прыцягваць да суровай партыйнай і судовай адказнасьці. ЦК указвае на неабходнасьць сьмелага высоўваньня беспартыйных настаўнікаў, якія добра правялі сябе на рабоце, на адказную работу, на работу ў старэйшыя канцэнтры, на навуковую работу. Праводзячы далей барацьбу з клясава-варожымі элементамі сярод настаўнікаў, неабходна яшчэ больш уцягнуць асноўную масу настаўніцтва ў актыўную работу па сацыялістычным будаўніцтве.

6.

Асноўнай задачай НКА зьяўляецца ўзмацненьне мэтадычнага кіраўніцтва школай і ў прыватнасьці распрацоўка пытаньняў палітэхнізацыі. Праводзячы далей і ўзмацняючы работу па палітэхнізацыі школ, вядучы рашучую барацьбу са скажэньнямі палітэхнізму (выкарыстоўваньне вучняў, як рабочай сілы, адрыў тэарытычнага навучаньня ад практычнай работы і г. д.), неабходна ўзмацніць увагу да ўладаньня вучнямі навыкамі пісьменьня, лічэньня, ведамі па гісторыі, геаграфіі, фізыцы, да павышэньня агульна-асьветнага ўзроўню школ.

ЦК лічыць неабходным рэарганізацыю навукова-мэтадалёгічнага камітэту Наркамасьветы ў Даяржаўны Навуковы Савет з прыцягненьнем да работы ў 1м найбольш кваліфікаваных навуковых маркасьцкіх сіл.

ЦК звяртае ўвагу на неабходнасьць у мэтах паляпшэньня якасьці работы школ, максымальнага ўцягненьня настаўнікаў у сыстэму завочнага навучаньня, арганізацыі палітэхнічных гурткоў, зьмест работ якіх павінен быць дапасован да спэцыялізацыі раёнаў або вытворчасьці, да якой прымацавана дана школа.

7.

Адзначаючы, што пастанова СНК БССР аб пераводзе на настаўніцкую работу ўсіх асоб, якія скончылі педагагічныя навучальныя ўстановы, але працуюць не па спэцыяльнасьці, да гэтага часу ня выканана, — ЦК прапануе гаркомам і райкомам КП(б)Б у найкарацейшы тэрмін забясьпечыць поўнае выкананьне гэтай дырэктывы.

8.

Адной з асноўных задач новага навучальнага году зьяўляецца максымальнае разгортваньне сеткі тэхнічнай асьветы. ЦК прапануе ў дэкады тэрмін распрацаваць пытаньне аб адзіным кіраўніцтве і сыстэме тэхнічнай вучобы.

9.

Адначаючы, што пасьля пастановы ЦК КП(б)Б асьвятленьне пытаньняў культурнага будаўніцтва з боку цэнтральнага друку, а таксама «Палескай праўды» палепшылася, ЦК указвае, што мясцовыя раённыя газэты да гэтага часу зусім незадавальняюча асьвятляюць пытаньні культурнага будаўніцтва.

ЦК папярэджвае супроць асьлепленьня ўвагі да пытаньня культурнага будаўніцтва з боку цэнтральнага друку і прапануе гаркомам і райкомам прыняць абходныя меры да ўзмацненьня асьвятленьня ў газэтах культурнага будаўніцтва ў гарадох і рабках.

10.

ЦК указвае Бярэзінскаму, Глускаму, Капыльскаму, Асіпавіцкаму, Старадарожскаму, Смалявіцкаму, Аршанскаму, Талачынскаму, Прапойскаму, Чэрвеньскаму, Лагойскаму, Ельскаму, Лепельскаму і Ушацкаму райкомам на непыхкавае выкананьне дырэктывы ЦК аб пасылцы сваіх стаўнікоў на міжраённыя нарады падрыхтоўцы да навучальнага году.

11.

Паставіць на адным з бліжэйшых пасяджэньняў Бюро ЦК КП(б)Б дакладу Наркамасьветы аб канкрэтных мерапрыемствах па рэалізацыі пастановы ВсеКП(б) аб масавай школе.

Гомельскія асьветнікі прыступілі да рэалізацыі пастановы ЦК УсеКП(б)

Пастанова ЦК УсеКП(б) аб пачатковай і сярэдняй школе выклікала вялікі энтузіязм сярод асьветнікаў Гомельшчыны.

Асьветнікі ўзялі на сябе абавязацельствы: давесьці пастанову ЦК УсеКП(б) да кожнага рабочага, калгасьніка, бедняка і сярэдняка — аднасобніка, да кожнай школы і вучня. Пераварыць Гомель і прыгарадныя раёны ў раёны суцэльнай пісьменнасьці да 1-га мая 1932 году. Дабіцца, каб навідзін вучань ня вышаў са школы ня скончыўшы сямігодку. Сваячасова дабранасна рыхтавацца да заняткаў. Арганізаваць сыстэматычную мэтадычную работу. Аўладаць элементамі тэхнікі на працягу гэтага году. На 100 проц. ахапіць свае рады рознага роду навучаньнем. Зараз-жа арганізаваць дапамогу адстаючым вучням. Перагледзець праграмы ФЗС, КС, ШКМ. Усю работу школы ўвязаць з практыкай на прадпрыемстве, саўгасе, калгасе.

Узяць культшэфства па арганізацыі гурткоў і інш. відаў барацьбы за ўкараненьне тэхнікай на прадпрыемствах.

Праз прымацаваньне да прадпрыемстваў МТС, калгасаў і саўгасаў, арганізацыі ўдзел асьветнікаў у прапрацоўцы рабочымі і калгасьнікамі прамфінпляну і пляну калгасаў і саўгасаў 4-га году пяцігодкі. Дапамагчы калгасам і саўгасам у давядзеньні тэхнікаў асьвятній і весьнавой пісьменнасьці да кожнай калгасьніка і адзінаснікі.

Дабіцца ахопу сацспаборніцтвам ня менш 100 проц. і ўдарніцтвам 75 проц. сваіх радоў на працягу верасьня-трычніка месяцаў.

АСЬВЕТНІКІ ГОМЕЛЬШЧЫНЫ ЗВАРОТКЛІКАЮЦЬ УСІХ РАБОЧЫХ, КАЛГАСЬНІКАЎ І ЎСЮ МАСУ АСЬВЕТНІКАЎ ІНШЫХ РАЁНАЎ ПА-БАЯВОЙ РЭАЛІЗАВАЦЬ ПАСТАНОВУ ЦК УсеКП(б) АБ ПАЧАТКОВАЙ І СЯРЭДНЯЙ ШКОЛЕ.

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

ПА-БАЛЬШАВІЦКУ ПРАВЕСЬЦІ

ПЕРАВЫБАРЫ БЮРО ВУЗАЎСКІХ ПАРТКАЛЕКТЫВАЎ І ЯЧЭЕК

УСІМ ПАРТКАЛЕКТЫВАМ І ЯЧЭЙКАМ КП(б)Б ВНУ, ВТНУ І ТЭХНІКУМАУ г. МЕНСКУ

Паводле пастановы бюро гаркому КП(б)Б з 1-га верасьня па 15-га кастрычніка павінны быць праведзены чарговыя перавыбары бюро парткалектываў і ячэек КП(б)Б навучальных устаноў г. Менску.

Уся работа па перавыбарах павінна праходзіць пад кутом далейшай барацьбы на два фронты, у першую чаргу з правым апартунізмам, а «левымі» загібамі і прымірэнцкімі адносінамі да іх, пад кутом барацьбы за правільнае і выразнае правядзеньне ленінскай нацыянальнай палітыкі партыі, супроць вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай небясьпекі, супроць рэшткаў контр-рэвалюцыйнага беларускага нацыянал-дэмакратызму і супроць шавінізмаў іншых колераў, за поўную беларусізацыю ўсіх навучальных устаноў.

Надыходзячыя перавыбары павінны быць скарыстаны для далейшай мабілізацыі ўвагі партарганізацый навучальных устаноў і студэнцкай масы вакол задач 3-га рашаючага году пяцігодкі, барацьбы за пралетарскія кадры і аўладаньне тэхнікай, як аднаго з самых адказьнейшых вучасткаў сацыялістычнага будаўніцтва. Перабудова парт., праф., камсамольскай работы ў напрамку перанясеньне цэнтру цяжару ў брыгаду, ажадэм-групу і спэцыяльнасьць (ці аддзяленьне), паваротку ўсіх студэнцкіх арганізацый тварам да пытаньняў вытворча-акадэмічнага жыцьця навучальнай установы, да пытаньняў рэарганізацыі вышэйшай і сярэдняй школы ў адпаведнасьці з пастановай партыі па гэтым пытаньні.

Гарком КП(б)Б прапануе ячэйкам і парткалектывам у зьвязку з перавыбарамі правесьці наступную канкрэтную работу:

1.

Да перавыбараў правесьці шырокую самаправерку ўсёй работы партгруп, ячэек і парткалектываў, склаўшы самаправерачныя брыгады па ўсіх асноўных пытаньнях работы. У работу самаправерачных брыгад уцягнуць пагалоўна ўсіх камуністаў пад лёзунгам: «Кожны камуніст — актыўны ўдзельнік (па сваім выбары) у рабоце адной з самаправерачных брыгад».

Самаправерку і зьмест дакладаў на справаздачных сходах сканцэнтраваць на тых пытаньнях і задачах, якія былі вызначаны пастановаю бюро гаркому КП(б)Б ад 14-га красавіка 1931 г. («Становішча і задачы перабудовы парт-работы калектываў і ячэек КП(б)Б ВНУ і ВТНУ»), іменна вакол ажыцьцёўленьня партармейцамі наступных пытаньняў:

а) як ячэйка і калектыў здолелі забясьпечыць сапраўды бальшавіцкія тэмпы і якасьць работы ў выкананьні вытворча-акадэмічных планаў, праграм і барацьбу з апартуністычнымі скажэньнямі лініі партыі ў навучальнай установе: «Барацьба за партыйнасьць у навуцы, за няўхільнае правядзеньне марксыцка-ленінскай мэтадалёгіі ў выкладаньні ўсіх дысцыплін, супроць усялякага роду буржуазных і дробна-буржуазных мэханістычных, ідэалістычных і іншых варожых нам тэорый (барацьба з Рубінштчынай і Дэборынчынай); за сталую сувязь тэорыі з практыкай сацыялістычнага будаўніцтва і за найлепшую пастаноўку асабліва вытворчага навучаньня і пытаньняў, зьвязаных з палітэхнізацыяй ВНУ і ўдасканаленьнем профілю будучага спэцыяліста; за канчатковы і правільны пераход на актыўны і лябараторны мэтады выкладаньня, за сталы ўлік пасьпяховасьці і вывучэньне працэсу працы кожнага студэнта, супроць сыстэмы залікаў, якая існуе да гэтага часу за дапамогу адстаючым у вучобе, за арганізацыю і ажыўленьне работы вытворчых нарад і катэдраў» (З пастановы Бюро ГК ад 14/IV-31 г.).

б) Становішча сацспаборніцтва і ўдарніцтва, кіраўніцтва ўдарным рухам і работа брыгады, як аснoўнага зьвяна гэтага руху. Авангардная роля камуністаў у сацспаборніцтве і ўдарніцтве і ва ўсёй вытворча-акадэмічнай рабоце.

в) Як забясьпечана правядзеньне ленінскай нацыянальнай палітыкі і выкананьне пастаноў кастрычніцкага пленуму ЦК УсеКП(б) па гэтым пытаньні, у прыватнасьці поўная беларусізацыя навучальнай і сярэдняй школы ў адпаведнасьці з пастановай партыі па гэтым пытаньні.

г) Барацьба за разгортваньне бальшавіцкай крытыкі і самакрытыкі і з канкрэтнымі фактамі яе заціску.

д) Практычная работа партарганізацыі па паляпшэньні матар'яльна-бытавых умоў пралетарскага студэнцтва.

2.

Дакладна вызначыць усе тыя вытворча-акадэмічныя вучасткі, дзе павінны быць арганізаваны партгрупы (у тых месцах, дзе апошнія да гэтага часу не былі створаны), кіруючыся пастановай бюро гаркому, што ў кожнай вытворча-акадэмічнай адзінцы, у якой налічваецца 3 члены партыі, павінна быць створана партгрупа з выбарным парторгам.

3.

Перавыбары арганізаваць так, каб перш за ўсё былі выбраны групоргі (з іхнімі справаздачай), потым бюро ячэек, пасьля чаго парткалектыву. Зараз-жа пасьля заканчэньня перавыбараў бюро ячэек і парткалектываў вылучаюць новых парторгаў, арганізатараў ва ўсіх тых вытворча-акадэмічных адзінках, у якіх ёсьць камуністы ў колькасьці менш 3-х чал. Да перавыбараў прыстасаваць і арганізацыйна сэктароў пры бюро ячэек і парткалектываў, выходзячы пры гэтым з тых прынцыпаў, якія былі ўстаноўлены пастановай бюро гаркому ад 14/IV-31 г.

4.

Гарком раіць для абмену вопытам арганізаваць узаемную самаправерку работы парткалектываў, прыкладнае: хэміка-тэхналёгічны Інстытут з Інстытутам Будаўнічым; Пэдінстытут з Мэдінстытутам і г. д. па ўласнай дагаворнасьці паміж сабою ячэек і парткалектываў.

5.

Выбары павінны быць скарыстаны для ўцягненьня ў кіруючыя парторгіцы навучальных устаноў лепшых камуністаў з рабочых і батракоў, а таксама для павялічэньня ў складзе бюро камуністак-работніц і батрачак, якія паказалі прыклад бальшавіцкіх тэмпаў у вучобе і рабоце, вдольных змагацца на два фронты за генэральную лінію партыі.

Уся работа па перавыбарах павінна праводзіцца па адкрытых сходах ячэек і калектываў з максымальным прыцягненьнем на гэтыя сходы шырокіх мас студэнцтва і навуковых работнікаў.

Ва ўсёй рабоце па праверцы і на справаздачных сходах павінна быць забясьпечана бязьлітасная бальшавіцкая самакрытыка ўсёй работы ячэек і калектываў, прарываў і недахопаў, якія ў ёсьць.

Сакратар Менгаркому КП(б)Б КАВАЛЬЧУК.

ПРАВЕРЫМ РЭАЛІЗАЦЫЮ УКАЗАНЬНЯЎ т. СТАЛІНА

Камбінат „Спартак“ ПАВЯЛІЧЫЎ ВЫПРАЦОЎКУ У ДВА РАЗЫ

ПЕРАМОГУ ДАЛІ ліквідацыя ўраўнілаўкі і абязьлічкі

КАМБІНАТ «СПАРТАК» СЕЛЬХАРЧПРОМУ (ГОМЕЛЬ) ЛІЧЫЎСЯ САМЫМ ГОРШЫМ ПА ВЫКАНАНЬНІ ПРАМФІНПЛЯН ТАМУ, ШТО ПАРТКІРАЎНІЦТВА І ІНШЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ НЯ ЗДОЛЕЛІ МАБІЛІЗАВАЦЬ МАСЫ НА БАРАЦЬБУ З ПРАРЫВАМІ.

ПАСЬЛЯ ЗЬМЕНЫ СТАРОГА ПАРТКІРАЎНІЦТВА І НЕКАТОРЫХ ІНШЫХ ПРАЦАЎНІКОЎ НА ФАБРЫЦЫ ДАСЯГНУТ ЗНАЧНЫ ПЕРАЛОМ.

ТРЫКУТНІК ПРАКТЫЧНА ЎЗЯЎСЯ ЗА АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЕ ЎКАЗАНЬНЯЎ ТАВ. СТАЛІНА. ЛІКВІДАВАНЫ АБЯЗЬЛІЧКА І ЎРАЎНІЛАЎКА Ў АПЛАЦЕ. УВЕДЗЕНА ІНДЫВІДУАЛЬНАЯ І ГРУПАВАЯ ПРАГРЭСЫЎНА-ПРЭМІЯЛЬНАЯ ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНА. З КОЖНЫМ ДНЁМ ПАВЯЛІЧВАЕЦЦА КОЛЬКАСЬЦЬ ВЫПУШЧАНАЙ ПРАДУКЦЫІ, А РАЗАМ З ГЭТЫМ ПАВЫШАЕЦЦА ЗАРПЛАТА РАБОЧЫХ. ТАК, НАПРЫКЛАД, ВАРШЧЫК (МЯККІ ЦЭХ) ЗАРАЗ АТРЫМЛІВАЕ 125-130 РУБ. У МЕСЯЦ ЗАМЕСТ 65 РУБ. ПРЫ ЎРАЎНІЛАЎЦЫ, РЭЗЧЫЦА ЗАРАБЛЯЕ 70-75 РУБ. ЗАМЕСТ 35-40 І Г. Д.

ДЛЯ ЛІКВІДАЦЫІ ПРАРЫВУ БЫЎ АБВЕШЧАН 20-ЦІДЗЕННЫ ШТУРМ. ПАРТЫЙНА-КАМСАМОЛЬСКІ КАЛЕКТЫЎ АБЯРЭЦЦІЎ СЯБЕ МАБІЛІЗАВАНЫМ НА БАРАЦЬБУ З ПРАРЫВАМ, ПРЫЦЯГНУЎШЫ ДА ГЭТАЙ РАБОТЫ І БЕСПАРТЫЙНУЮ МАСУ.

ЗАРАЗ МЯККІ ЦЭХ, ЯКІ ВЫКОНВАЎ ПРАГРАМУ НА 64 ПРОЦ., ПАКАЗВАЕ БАЛЬШАВІЦКІЯ ТЭМПЫ ПРАЦЫ. ЕН ВЫКОНВАЕ СВАЮ ПРАГРАМУ НА 124 ПРОЦ. ТАКОЕ СТАНОВІШЧА НАГЛЯДАЕЦЦА І Ў ДРУГІХ ЦЭХАХ. НА ВЕЧАРЫ, ПРЫСЬВЕЧАНЫМ ДАСЯГНЕНЬНЯМ ПА ЛІКВІДАЦЫІ ПРАРЫВУ, ТРЫКУТНІК ПРЫПАДНЕС ЧЫРВОНЫ ПЕРАХОДНЫ СЬЦЯГ МЯККАМУ ЦЭХУ, А ЛЕПШЫЯ ЎДАРНІКІ ПРЭМІЯВАНЫ І ЗАНЕСЕНЫ НА ЧЫРВОНУЮ ДОШКУ.

25-ГА ЖНІЎНЯ 1931 Г. СЕМНАЦЦАЦЬ СТАРЫХ РАБОЧЫХ ПАДАЛІ КАЛЕКТЫЎНУЮ ЗАЯВУ АБ ЎСТУПЛЕНЬНІ Ў ПАРТЫЮ, 75 МАЛАДЫХ РАБОЧЫХ — У КАМСАМОЛ, 29 БЕСПАРТЫЙНЫХ РАБОЧЫХ АБВЯСЬЦІЛІ СЯБЕ ЎДАРНАЙ БРЫГАДАЙ «АБАРОНЫ КРАІНЫ». РАБОЧЫ КАЛЕКТЫЎ У ТОЙ-ЖА ДЗЕНЬ ДАЎ АБЯЦАНЬНЕ ЗЬВЯРНУЦЬ ДЗЯРЖАВЕ 1.500.000 РУБ., ЯКІЯ НЕ ДАДАНЫ Ў ЧАСЕ ПРАРЫВУ.

МАЮЦЦА ЗНАЧНЫЯ ПОСЬПЕХІ ПА РЭАЛІЗАЦЫІ ПАЗЫКІ «ТРЭЦІ РАШАЮЧЫ». ДАДАТКОВА РЭАЛІЗАВАНА НА 7.200 РУБ.

ВУЗКАЕ МЕСЦА НА СЕНЕШНІ ДЗЕНЬ—ЯКАСЬЦЬ ПРАДУКЦЫІ. АЛЕ ПРЫ ПРАВІЛЬНЫМ КІРАЎНІЦТВЕ ПАРТЫЙНА-ПРАФСЭЫЯНАЛЬНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ ГЭТЫ НЕДАХОП БУДЗЕ КАНЧАТКОВА ЗЬНІШЧАН.

І. ПЕРЭЛЬМАН.

„Там паглядзім...“

ТАКІ АДКАЗ АТРЫМЛІВАЕ РАБОЧЫ ГАРБАРНІ ІМЯ СТАЛІНА на ЗАПЫТАНЬНЕ АБ РАСЦЭНКАХ.

Магілеўская гарбарня Імя Сталіна не перабудавалася ў адпаведнасьці з апошняй прамовай т. Сталіна на нарадзе гаспадарнікаў.

На заводзе ня зьніш



Магнітабуд—сусьветны гігант мэталюргіі На здымку, коксахімкамбінат—скаўбэры

9.000 РАБОЧЫХ—ДАНБАСУ

У КЛІЧАВЕ ВЯРБОУКА ІГНАРУЕЦЦА

У ЦЕРАХАУСКІМ РАЁНЕ СТВОРАНА ПЕРШАЯ БУКСІРНАЯ БРЫГАДА

НА ГРАМАДЗКІ БУКСІР АДСТАЮЧЫЯ РАЕНЫ І СЕЛЬСАВЕТЫ

КЛІЧАЎ. Кіраўнікі Клічаўскага раёну недаэцэньваюць палітычнага значэньня вярбоўкі рабочай сілы для Данбасу. З боку асобных старшынь сельсаветаў справа вярбоўкі рабочых для Данбасу ігнаруецца. Так, старшыня Ваевіцкага сельсавету ЯКІМАВЕЦ адмовіўся паставіць гэта пытаньне на пленуме сельсавету.

Нам. сакратарэ ячэйкі КП(б)Б калгасу «Беларусь» МІЦКЕВІЧ замест практычнай дапамогі вярбоўшчыку Данбасу займаецца «очковтирательством», даводзячы, што няма вольнай рабочай сілы і г. д. Між тым, самі калгасьнікі кажуць, што можна ўзяць некалькі чалавек, што гэта не адаб'ецца на працы калгасу. Міцкевіч абяцаў вярбоўшчыку склікаць сход і вызначыў дзень; аднак, у гэты дзень сходу на было. Ня было яго і нагул. Толькі па калгасе «Іскра камуны» выпучана для Данбасу 7 маладых калгасьнікаў.

На 11 верасьня Клічаўскі раён паспаў у Данбас толькі 32 чал. замест 200 паводле кантрольнай лічбы НКПБ.

***

ЦЕРАХОЎКА. У раёне разгарнулася шырокая растлумачальная работа па вярбоўцы. 9 верасьня адбылася нарада ўсіх старшынь сельсаветаў і сакратароў парт'ячэек, дзе пытаньне аб вярбоўцы было нарадай апстаўлена ў розкай форме. Нарада арганізавала камісію садзейнасьці. Сельсаветы раёну заключылі дагаворы ПА САЦСПАБОРНІЦТВЕ на лепшае выкананьне і перавыкананьне заданьня па вярбоўцы.

Раённая камісія садзейнасьці вярбоўцы арганізавала БУКСІРНУЮ БРЫГАДУ для падцягваньня больш слабых сельсаветаў. Раён павінен даць Данбасу 240 рабочых. На сёньнішні дзень завербавана 30 чал.

***

ХОЙНІКІ. 12 верасьня паслана ў Данбас 50 рабочых. За ўвесь час вярбоўкі паслана 203 чал. Заданьне—300.

***

КЛІМАВІЧЫ. Вярбоўшчык Горлаўскага рудакіраўніцтва КУДЗЯНКОЎ сарваў вярбоўку 400 чал., самавольна выехаўшы дамоў. Справа перадана пракурору.

***

БЕШАНКОВІЧЫ. 11 верасьня накіравана ў Данбас 41 чал. Вярбоўка ідзе вельмі марудна: за ўвесь час накіравана ў Данбас толькі 56 чал., што складае 25 проц. заданьня. Як паведамляе вярбоўшчык, 14 верасьня будзе паслана яшчэ 35 чал.

***

СУРАЖ. Віцебская пошта адмовілася даць вярбоўшчыку аўтабусы для перакідкі завербаваных рабочых з Суражу ў Віцебск для накіраваньня іх у Данбас. Згодна паведамленьня вярбоўшчыка, райарганізацыі не садзейнічаюць вярбоўцы. Раён паавінен даць 350 будаўнікоў для Данбасу. Аб колькасці завербаваных вестак няма.

АБ ГАСПАДАРЧА-РАЗРАХУНКОВЫХ БРЫГАДАХ

ПАСТАНОВА ВСНГ СССР І УсеЦСПС

Па ініцыятыве рабочых раду прадпрыемстваў за апошні час узьнікла новая форма сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва—гаспадарча-разрахунковыя брыгады.

Гаспадарча-разрахунковыя брыгады дабіліся канкрэтных дасягненьняў у справе выкананьня і перавыкананьня колькасных і якасных паказальнікаў прамфінпляну і зьяўляюцца аднэй з форм барацьбы за правільную арганізацыю працы, за ўкараненьне гаспадарчага разрахунку ў работу прадпрыемстваў, за далейшае разьвіцьцё сацспаборніцтва на падставе росту матар'яльнай зацікаўленасьці рабочых у павышэньні прадукцыйнасьці працы.

Выходзячы з гэтага, ВСНГ СССР і УсеЦСПС прапануюць усім гаспадарнікам, адміністрацыйна-тэхнічнаму пэрсаналу і прафэсыянальным арганізацыям усямерна падтрымаць і стаць на чале далейшага разьвіцьця гаспадарча-разрахунковых брыгад, для чаго:

1. Заводзкай і цэхавай адміністрацыі стварыць усе неабходныя ўмовы для пасьпяховага пераводу брыгад на гаспадарчы разрахунак. У гэтых мэтах перагледзець існуючую разьбіўку рабочых на брыгады пад кутом погляду адпаведнасьці тэхналёгічнаму працэсу, ліквідацыі абязьлічкі абсталяваньня і ўраўнілаўкі ў аплаце працы шляхам прымацаваньня брыгад да пэўных варштатаў і агрэгатаў і пераходу на зьдзельную аплату працы.

Адначасова стварыць умовы для пасьпяховай барацьбы за эканомію матар'ялаў, сырцу, энэргіі, інструманту шляхам пастаноўкі іх правільнага цэннаснага ўліку і нармаваньня, зьнішчэньня непрадукцыйных затрат рабочай сілы, шляхам паляпшэньня ўнутрыцэхавага плянаваньня і правільнай арганізацыі рамонту.

2. Гаспадарча-разрахунковая брыгада атрымлівае ад начальніка цэху вытворчае заданьне-нарад, у якім брыгадзе ўказваюцца колькасныя і якасныя паказальнікі, нормы прадукцыйнасьці працы, нормы браку і залежачых ад брыгады накладных выдаткаў (энэргія, амартызацыя, рамонт інструмантаў і варштатаў і г. д.) у цэннасным і натуральным выражэньні.

3. На падставе нараду гаспадарча-разрахунковая брыгада заключае з адміністрацыяй цэху гаспадарча-разрахунковы дагавор, у які ўносіцца:

а) вызначаныя брыгадай у парадку сустрэчнага пляну колькасныя паказальнікі, нормы накладных выдаткаў, а таксама абавязацельствы брыгады па павышэньні прадукцыйнасьці працы, памяншэньні і ліквідацыі браку, эканоміі выдатку асноўных і дапаможных матар'ялаў, ліквідацыі прагулаў і прастояў, выкананьні работы з меншай колькасьцю рабочых, скарачэньні затраты часу на падрыхтоўчую работу, сыстэматычным паляпшэньні якасьці і зьнижэньні сабекошту выпускаемай прадукцыі;

б) абавязацельствы адміністрацыі ў адносінах своячасовага забесьпячэньня брыгады сырцом, матар'яламі і інструмантамі, своячасовага рамонту абсталяваньня, арганізацыі ўліку сабекошту і абавязацельствы па прэміяваньні брыгады за яе дасягненьні па якасных паказальніках.

4. Прэмія выплачваецца штомесячна і вылічваецца ад эканоміі, якая атрымліваецца брыгадай у выніку перавыкананьня даных адміністрацыяй у нарадзе норм выдаткаваньня сырцу, матар'ялаў, інструмантаў, рабочай сілы. Разьмер прэмій (ад 20—60 проц. атрыманай эканоміі) дакладна паказваецца ў дагаворы.

Разьмеркаваньне прэмій унутры брыгады робіцца з улікам кваліфікацыі членаў брыгады, якасьці і колькасьці работы кожнага ўдзельніка. Брыгада можа пазбавіць гэтай прэміі часткова ці поўнасьцю асобных сваіх удзельнікаў за прагулы, брак, перавыдатак матар'ялаў і г. д., скарыстоўваючы гэтым самым прэміяваньне для найбольшага заахвочваньня лепшых рабочых-ударнікаў.

5. Гаспадарча-разрахунковая брыгада ствараецца па ініцыятыве саміх рабочых, але з абавязковым пацьвярджэньнем з боку адміністрацыі. Асобай адміністрацыйна-адказнай за работу брыгады зьяўляецца брыгадзір, які назначаецца начальнікам цэху. Брыгадзір не вызваляецца ад вытворчасьці і за арганізацыю работы брыгады атрымлівае надбаўку да сваёй зарплаты ў разьмеры прыкладна 25 проц. заработку, атрымліваючы звыш таго прэмію на агульных з усёй брыгадай падставах.

6. Гаспадарчыя і прафэсыянальныя арганізацыі павінны рашуча пакончыць з маючымі месца скажэньнямі ў практыцы пераводу брыгад на гаспадарчы разрахунак, як: устанаўленьне матар'яльнай няўстойкі з боку рабочых, насаджэньне гаспадарча-разрахунковых брыгад у адміністрацыйным парадку, адступленьне ад правілаў унутранога распарадку, парушэньне брыгадай данага ёй нараду, надзяленьне гаспадарча-разрахунковых брыгад зваротнымі сродкамі і г. д.

ВСНГ і УсеЦСПС, улічваючы важнасьць разьвіцьця гаспадарча-разрахунковых брыгад у мэтах дасягненьня правільнай арганізацыі працы на вытворчасьці, укараненьня гаспадарчага разрахунку і далейшага разгортваньня сацспаборніцтва, патрабуюць ад адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу і прафсаюзных артанізацый максымальнай увагі і дакладнай падрыхтоўкі да пераводу брыгад на гаспадарчы разрахунак.

Старшыня ВСНГ СССР **С. Арджанікідзэ.**

Сакратар УсеЦСПС **Швэрнік.**

Масква,
11-га верасьня 1931 г.

Напярэдадні манэўраў РСЧА

Гадавая вучоба Чырвонай арміі завяршаецца манэўрамі. Зьяўляючыся важнейшым зьвяном у агульнай сыстэме баявой падрыхтоўкі Чырвонай арміі, манэўры правяраюць слажанасьць часьцей Чырвонай арміі, узаемадзеяньне ўсіх відаў аброї ў баі.

Манэўры гэтага году ва многім адрозьніваюцца ад мінулых год тым, што будзе ўведзена вялікая колькасьць тэхнічных сродкаў барацьбы, якія ў значнай меры ажажуць свой уплыў на якасьць і характар сучаснага бою.

Да надыходзячых манэўраў павінны рыхтавацца ня толькі часьці Чырвонай арміі, але і ўсе савецкія, партыйныя, прафсаюзныя, камсамольскія і грамадзкія арганізацыі.

Трэба зараз-жа павесьці шырокую агітацыйна-масавую растлумачальную работу сярод насельніцтва, растлумачваючы мірную палітыку партыі і ўраду, узрастаючую пагрозу інтэрвэнцыі з боку імпэрыялістаў, неабходнасьць усямернага ўзмацненьня абароназдольнасьці краіны, аднатасова даючы рашучы адпор розным праваканцыйным кулацкім чуткам.

Асабліва сур'ёзныя задачы ў часе манэўраў стаяць перад арганізацыямі Асавіяхіму, Аўтадору, ТПР і Чырвонага крыжу ў галіне дапамогі часьцям Чырвонай арміі шляхам забесьпячэньня рамонту дарог у раёне манэўраў, арганізацыі аўтарамонтных майстэрань і г. д.

Ня менш адказныя задачы стаяць перад транспартам і органамі сувязі, яны павінны сумесьць своячасова без перабояў забясьпечыць перасоўваньне войск, наладзіць выразную непарыўную сувязь.

Органы спажывецкай кааперацыі і забесьпячэньня павінны адкрыць сетку харчовых пунктаў, сталовак, наркоў для бесьперабойнага забесьпячэньня войск.

Вялікія задачы ўскладаюцца на калгасы, саўгасы, МТС і на ўсё працоўнае насельніцтва вёскі.

Неабходна найшырэй папулярызаваць і поўнасьцю ажыцьцявіць адозву Калгасцэнтру СССР аб садзейнасьці часьцям Чырвонай арміі ў выглядзе прадастаўленьня транспарту, забесьпячэньня начлегам, прадастаўленьня фуражу, абслугоўваньня часьцей сталоўкамі, клюбамі, рамонтнымі майстэрнямі і інш.

Прадстаўчыя манэўры павінны быць найбольш скарыстаны для ўзмацненьня сувязі Чырвонай арміі з працоўнымі масамі рабочых, калгасьнікаў і аднаасобнікаў—беднякоў і сераднякоў. Растлумачэньне шырокім працоўным масам задач аб узмацненьні абароназдольнасьці нашай краіны, азнаямленьне байцоў Чырвонай арміі з посьпехамі і задачамі сацыялістычнага будаўніцтва—набывае выключна важнае значэньне.

Уся работа па аказаньні садзейнасьці манэўрэчным часьцям павінна быць цесна ўвязана з пасьпяховым правядзеньнем гаспадарча-палітычных задач. Датэрміновая здача таварнай прадукцыі дзяржаве шляхам арганізацыі чырвоных абозаў, выкананьне прамфінпляну, своячасовае скачэньне асеньняй сяўбы, арганізацыйна-гаспадарчае замацаваньне калгасаў, далейшы калгасны прыліў—у гэтым адна з найвялікшых задач узмацненьня абароназдольнасьці нашай краіны.

СКУРАТ.

Частку рабочай сілы—перакінуць на будаўніцтва

ТАЛАЧЫН. У саўгасе «РАЙЦЫ» неабходна пабудаваць 6 сьвінарнікаў і 1 калятар. Тэмпы будаўніцтва не забясьпечваюць своячасовага выкананьня плянку будаўніцтва. На сёньнішні дзень заканчваецца пабудова аднаго сьвінарніка для паросных матак.

Да будаўніцтва іншых яшчэ не прыступілі.

Тэхнік тлумачыць гэты прарыў недахватам рабочай сілы. Між тым частку рабочай сілы можна перакінуць на будаўніцтва з палявых работ, якія ўжо канчаюцца.

Трэба зараз-жа пакончыць з недаацэнкай будаўніцтва сьвінарнікаў, узмацніць тэмпы будоўлі, каб у найкарацейшы тэрмін скончыць пабудову 6 новых сьвінарнікаў.

Селькор В. А. В.

ІЛЬНАЗАВОДЫ

ПУШЧАН новы ільназавод імя Сталіна

ШКЛОЎ. (Наш кар.). Адбыўся ўрачысты пуск новага ільназаводу. На мітынгу, прысьвечаным пуску заводу, прысутнічала каля 200 калгасьнікаў, прадстаўнікі раённых партыйных, камсамольскіх, прафэсыянальных і савецкіх арганізацый і прадпрыемстваў, чырвонаармейцы, а таксама прыехаўшы з Менску прадстаўнік ЦК КП(б)Б тав. **Васэрман.** Заводу надана імя тав. Сталіна.

Новы ільназавод ужо ў гэтым годзе павінен апрацаваць 8.000 тон ільнасаломы і трасты. З устаноўкай яшчэ аднэй машыны прадукцыйнасьць яго можа быць павялічана да 12.000 тон. У сімовы час на заводзе будзе занята 230 рабочых, а ўлетку — каля 400. Ільназавод поўнасьцю забясьпечан рабсілай. Раённы камітэт камсамолу ўзяў шэфства над новым ільназаводам і пастанавіў мабілізаваць для работы па ім 50 камсамольцаў.

Новы завод мае ўсе магчымасьці ня толькі выканаць, але і перавыканаць прамфінплян. Абсталявана магутная электрастанцыя, ёсьць патрэбнае абсталяваньне.

Лепшыя ўдарнікі будаўніцтва прэміяваны. Пасланы прывітальныя тэлеграмы ЦК УсеКП(б) — тав. Сталіну, ЦК КП(б)Б, «Зьвязьдзе», СНК БССР, ЦСПСБ і №-скаму палку. Над апошнім ільназавод прыняў шэфства.

Калгасьнікі праявілі вялікі інтарэс да ільназаводу і дэтальна азнаёміліся з пастаноўкай работы на ім.

НОВІК.

Прайшло шмат часу...

ВЕТРЫНА. (Наш кар.). Да 1-га кастрычніка Ветрынскі ільназавод павінен быць пушчан. Вытворчы корпус у асноўным скончан. Цяпер павінны былі ўжо разгарнуцца мантажныя работы. Але да гэтага часу няма лёкамабіля і іншага абсталяваньня.

Кіраўніцтва заводу своячасова паведамляла аб гэтым Галоўленком і Белільнаканапляводбуд. Прайшло шмат часу, а вынікаў ніякіх.

Калі Белільнаканапляводбуд ня прыме рашучых мер да адгрузкі абсталяваньня, своячасовы пуск заводу будзе сарваны. Не наладжана таксама рабочае забесьпячэньне. Каапэрацыя ня прымае ніякіх мер.

Фэльдман.

Адвесьці пагрозу

КРУПКІ. (Наш кар.). Крупскі ільназавод павінен быць пушчан 20-га верасьня. Засталіся лічаныя дні. Між тым да гэтага часу няма лёкамабіля, кудзельнай машыны і г. д. Не падрыхтавана памяшканьне для прыёмкі сырцу. Завод не забясьпечан рабочай сілай. Няма кватэр для рабочых і служачых. Адміністрацыя будаўніцтва бязьдзейнічае. Дрэнна арганізавана пажарная ахова.

Патрэбны рашучыя меры, каб забясьпечыць своячасовы пуск новага ільназаводу.

Алімар.

Дзе-ж абсталяваньне?

ДУБРОЎНА. (БЕЛТА). Будаўніцтва Дубровенскага ільназаводу набліжаецца да канца. Да 1-га кастрычніка асноўны вытворчы корпус ільназаводу і памяшканьне для складу будуць поўнасьцю скончаны. Мантаж тармозіцца з-за неатрыманьня поўнага камплекту абсталяваньня. Прыслана дынама, а лёкамабіля і турбіны няма.

„ПАЛЕПШЫЦЬ БЫТАВЫЯ ЎМОВЫ РАБОЧЫХ—ТАКАВА ЗАДАЧА" (І. СТАЛІН)

МЭХАНІЗАВАНУЮ ПРАЛЬНЮ пабудаваць у тэрмін

Ва ўсіх наказах менскаму гарадзкому Савету ганаровае месца займаў пункт аб пабудове ў Менску вялікай механізаванай пральні.

Цяперашняя пральня перагружана, яна ня можа задаволіць патрэб насельніцтва. Бялізну трымаюць па месяцу і больш, блытаюць яе, выдаюць часамі ня поўнасьцю, па частках, прымушаюць хадзіць па яе па некалькі раз.

Будаўніцтва новай пральні — адна з асноўных задач па лініі культурна-бытавога абслугоўваньня рабочых, якую павінен быў вырашыць Менскі гарадзкі Савет.

Новая пральня павінна значна палепшыць бытавыя ўмовы рабочых, садзейнічаць вызваленьню жанчын ад хатняй работы і ўцягненьню іх у вытворчасьць.

Яшчэ ў мінулым годзе пачалі будаваць новую пральню і з вялікімі труднасьцямі вывелі адзін паверх. Другі паверх пачалі класьці ў гэтым годзе, але будаўніцтва ідзе чарапашымі тэмпамі.

Зьвыш 2 тыдняў на пабудове не працавалі, бо ня было жалезных балак. Запасу вапны хопіць на некалькі дзён. Два тыдні назад прыбыла тэлеграма з Камянец-Падольску, што вакна ўжо адпраўлена, але яе яшчэ няма. Для кладкі столі і падлогі патрэбны 6-5-мэтровыя дошкі. Дошкі прыбылі ў тэрмін, але 4-мэтровыя, якія няпрыгодны для будаўніцтва.

Чэрвеньскі пленум ЦК УсеКП(б) даў простую дырэктыву ўжываць мясцовыя будаўнічыя матар'ялы замест дэфіцытных. Тав. КАГАНОВІЧ у сваім дакладзе на пленуме ўказаў на неабходнасьць замены дахавага жалеза чарэпіцай.

Але справа ў тым, што ў праекце пабудовы пральні не прадугледжана замена дэфіцытных будаўнічых матар'ялаў мясцовымі. Каб рабіць чарапічны дах, трэба скласьці іншы праект, новую канструкцыю пабудовы.

Дрэннае становішча і з атрыманьнем унутранога абсталяваньня. На сёньнішні дзень Абкамтрэст атрымаў толькі 2 парамыйкі, 2 цэнтрафугі, 2 электраматоры. Не атрымана нават і 10 проц. патрэбнага абсталяваньня.

Ленінградзкі завод «Каапэратар» ня выконвае заказаў аддзелу камунальнай гаспадаркі.

«ВЭО» абяцае прыслаць электычнае абсталяваньне толькі ў санавіку 1932 г., хоць паводле дагавору заказ павінен быць выканан у трэцім квартале г. г.

Для вадаправоду, пароправоду патрэбна 40 тон розных труб. Абкамтрэст атрымаў усяго толькі 6 тон. Прыбыў нацёп для пральні, а труб да яго няма. Яшчэ ня прыбыло абсталяваньне для трансфарматарнай будні, якая заказана «ВЭО» і Эльвэду яшчэ ў мінулым годзе.

Менскі гарадзкі Савет мала што зрабіў для забесьпячэньня будаўніцтва патрэбнымі матар'ялямі і абсталяваньнем; гарсавет ня выконвае наказу выбаршчыкаў.

Мы патрабуем ад Менскага гарадзкога Савету прыняцьця неадкладных мер для фарсаваньня будаўніцтва пральні. Ні ў якім разе нельга затрымліваць пуск новай пральні, надзвычайна неабходнай працоўнаму насельніцтву.

Дырэктывы чэрвеньскага пленуму ЦК УсеКП(б) аб ліквідацыі адставаньня гарадзкой гаспадаркі ад агульных тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва, аб задаваленьні культурна-бытавых запатрабаваньняў мас павінны быць выкананы.

ЦЫВЕС.

ЗА ВЫРАЗНУЮ КЛЯСАВУЮ ЛІНІЮ пры правядзеньні сельска-гаспадарчага падатку

НОВЫ ЗАКОН АБ С.-Г. ПАДАТКУ зьяўляецца магутным вагаром калгаснага руху і ліквідацыі кулацтва як класа на базе суцэльнай калектывізацыі. Задача раённых арганізацый і ў першую чаргу фінорганаў — забясьпечыць правільнае, выразнае і клясава-вытрыманае правядзеньне ў жыцьцё новага закону.

Аднак, у радзе месц мы мелі сёлета грубейшыя скажэньні клясавай лініі пры правядзеньні с.-г. падатку. Правааапартуністычная практыка ў некаторых раёнах перапляталася з «левымі» загібамі. У **Вузьдзенскім, Сьвіслацкім, Клімавіцкім, Чэрыкаўскім, Старобінскім** раёнах «ня ўбачылі кулакоў». Раённыя арганізацыі нічога не зрабілі для выяўленьня ўсіх кулакоў і для індывідуальнага абкладаньня іх. Ва ўсіх гэтых раёнах выяўлена ўсяго ад 1 да 4 кулацкіх гаспадарак.

У **Лепьчыцкім, Буда-Кашалёўскім, Рогачоўскім, Гарадоцкім і Рэчыцкім** раёнах фінорганы «перастараліся» і залічылі ў кулакі яўна серадняцкія і нават маламоцныя гаспадаркі. **Бондараўскі** сельсавет, **Магілёўскага** раёну, прадставіў у раённую падатковую камісію для індывідуальнага абкладаньня 38 гаспадарак, з якіх 27 аказаліся серадняцкімі. Раённая камісія зацьвердзіла толькі 11 гаспадарак, але сельсавет не супакоіўся. Пачакаўшы крыху, ён зноў прадставіў райкамісіі для індывідуальнага абкладаньня гэтыя-ж гаспадаркі, упарта дабіваючыся, відавочна, санкцыянаваньня сваіх «левых» загібаў.

Сельсаветы **Ельскага** раёну прадставілі для індывідуальнага абкладаньня 123 гаспадаркі, з іх 118 былі зацьверджаны раённай камісіяй. Па іншых 5 гаспадарках матар'ял нават не разглядаўся. Роўна праз месяц раённая камісія без усякай праверкі чамусьці адмяняе індывідуальнае абкладаньне 75 гаспадарак.

Праведзеная спэцыяльная праверка выявіла, што індывідуальна па Ельскім раёне могуць быць абкладзены толькі 45 гаспадаркі, а іншыя 80 гаспадарак зьяўляюцца серадняцкімі. У лік 75 гаспадарак, па якіх райкамісія адмяніла індывідуальнае абкладаньне, уваходзіла многа яўна-кулацкіх гаспадарак.

Райкамісія перагварыла важнейшую палітычную справу — індывідуальнае абкладаньне — у простую «гульню» ў кулака. Многія гаспадаркі па некалькі раз абкладаліся і пераабкладаліся. Так, серадняк **Мазурэнка К.** 14 чэрвеня быў абкладзены як кулак, 16 ліпеня — як серадняк, 31 ліпеня — зноў як кулак, 18 жніўня — зноў як серадняк.

Затое матар'ял аб індывідуальным абкладаньні кулака **Якуба Карпава** «загінуў» у нетрах сельсавету і райфа, не дайшоўшы да РВК. Карпаў пралез у калгас, пры дапамозе сельсавету. Да ўступленьня ў калгас Карпаў меў 12 штук рагатай і 5 штук рабочай жывёлы, 3 хаты, складаныя сельска-гаспадарчыя машыны, эксплёатаваў кожны год каля 150 рабочых дзён нанятай рабочай сілы. Напярэдадні ўступленьня ў калгас ён разбазарыў сваю маемасьць. Ужо будучы «калгасьнікам» Карпаў утаіў ад абкладаньня 3,75 га азімых пасеваў і іншыя крыніцы даходу. Пралезьці ў калгас і ўтаіць аб'екты абкладаньня Карпаву дапамаглі старшыня і сакратар сельсавету і яго сын — член прэзыдыуму сельсавету. Заявы беднякоў у сельсавет і райфа аб абкладаньні Карпава ў індывідуальным парадку засталіся бяз вынікаў. Цяпер Карпаў знаходзіцца ў калгасе і імкнецца затрымаціць аграмадзканьне пасеваў.

Гэты факт сьведчыць аб праваапартуністычнай практыцы сельсавету і райфінаддзелу, якія патураюць кулаком, дапамагаюць ім схавацца ад індывідуальнага абкладаньня. Райфінаддзелам кіруе апартуніст **Пэпхоўскі**, які ўжо вядомы па скажэньнях клясавай лініі пры правядзеньні індывідуальнага абкладаньня ў былым Самахвалавіцкім раёне. Пры патураньні НКФ і сельскіх раённых арганізацый Палхоўскі застаецца непакараным і працягвае сваю агідную практыку.

У Дубровенскім раёне кампанія па с.-г. падатку прайшла самацёкам, без належнага кіраўніцтва з боку раённых арганізацый і райфа. Райвыканком толькі 3-га жніўня (праз 4 месяцы пасьля пачатку ўліку аб'ектаў абкладаньня) успомніў аб гэтым пытаньні і паставіў яго на пасяджэньні прэзыдыуму. У выніку бязьдзейнасьці раённых органаў акладныя лісты, перададзеныя платнікам замест 15 ліпеня толькі 16 жніўня; кан'юнктурныя даходы і сьпісы беднякоў-аднаасобнікаў на вызваленьне іх ад падатку раённай падатковай камісіяй не разглядаліся і не зацьвярджаліся, што зьяўляецца грубейшым парушэньнем закону. Бядняцкія гаспадаркі, якія сёлета ўступілі ў калгас, па некаторых сельсаветах ня вызвалены ад падатку.

Былы загадчык райфа **Браўдэ** з дазволу раённых кіруючых органаў у самы разгар кампаніі пашоў у адпачынак. Ня тым, вярнуўшыся з адпачынку, больш месяца не прыступаў да работы і, нарэшце, Наркамфін назначыў яго загадчыкам Полацкага райфа. Замест прыцягненьня да адказнасьці за зрыў кампаніі на сельгаспадатку ў Дуброўне, Наркамфін чамусьці знаходзіць магчымым вылучыць Браўдэ на пасаду загадчыка райфа буйнога прымежнага раёну, дзе, да рэчы кажучы, кампанія па с.-г. падатку была ўжо правалена з благаславеньня б. загадчыка **Адема**. Апошні таксама «ўзнагароджан» Наркамфінам, які перавёў яго ў Віцебск на пасаду загадчыка гарфа. Вынікі работы Браўдэ ў Полацку наступныя: з кулакоў замест 100 проц. гадавой сумы падатку на 1-га верасьня неспагнана ніводнай капейкі. З серадняцкіх гаспадарак замест 30 проц. гадавой сумы падатку на 1 верасьня паступілі толькі 24 проц. З калгасаў на 1 верасьня не паступіла ніводнай капейкі падатку.

Буда-Кашалёўская раённая падатковая камісія штампуе пастановы сельскіх камісій аб індывідуальным абкладаньні. З абкладзеных індывідуальна па Недайскім сельсавеце 11 гаспадарак 5 гаспадарак пры праверцы аказаліся серадняцкімі. Раённай падатковай камісіі разглядаць матар'ялы аб індывідуальным абкладаньні няма часу. Таму да зацьвярджэньня раённай камісіяй індывідуальнага абкладаньня райфа выпісваў тэй ці іншай гаспадарцы акладны ліст, як на кулака (грубейшае парушэньне закону). Пратаколаў аб зацьвярджэньні раённай камісіяй індывідуальнага абкладаньня няма. Важнейшае палітычнае мерапрыемства — індывідуальнае абкладаньне — праводзіцца «пасямейнаму» шляхам апытаньня, узгадненьня з членамі камісіі і г. д. Скаргі па сельгаспадатку валяюцца доўгі час у райфа без разгляду. Пры налічэньні падатку і запаўненьні акладных лістоў дапушчана шмат буйных памылак.

Да абкладаньня кан'юнктурных даходаў сельскія і раённая камісіі падыходзілі фармальна. Грамадзкасьць у работу ня была ўцягнута. Устаноўленыя выпадкі, калі абкладаліся кан'юнктурныя даходы ад продажу такіх прадуктаў, якіх у гаспадарцы зусім ня было. Ці, напрыклад, абкладаліся кан'юнктурныя даходы ад продажу ня толькі прадуктаў сельскай гаспадаркі, але ад продажу наогул маемасьці — хаты.

У **Гарадоцкім** раёне кампанія па с.-г. падатку праходзіла, як кажуць, «бяз руля і без вятрыл». Гэта пацьвярджаецца і тым, што на сёньнішні дзень ні райвыканкому і ні Наркамфіну невядомы вынікі ўліку аб'ектаў па раёне. Раённыя арганізацыі толькі «меркавалі» паслаць раённых работнікаў для практычнай дапамогі сельсаветам, але далей меркаваньняў справа не пасунулася. У выніку па раёне дапушчаны буйнейшыя скрыўленьні клясавай лініі. Абкладаліся нават кан'юнктурныя даходы ад продажу тых прадуктаў, па якіх гаспадарка выканала свае абавязацельствы перад дзяржавай. Сёлетнія калгасьнікі, а леташнія беднякі-аднаасобнікі ня вызвалены ад падатку. Па 20 сельсаветах ня выяўлена ніводнай кулацкай гаспадаркі, за тое абкладзены індывідуальна серадняцкія гаспадаркі (Гарапікаў Д., Патапаў, Гарошчанка С.). Кабішчанскі сельсавет упарта не жадае абкласьці індывідуальна б. памешчыку **Прансэўскую Ганну.** Дайшло да таго, што сельсавет ігнаруе пастановы раённай камісіі аб індывідуальным абкладаньні гэтай гаспадаркі.

Гэтыя факты — вынік махровай апартуністычнай практыкі, палітычнай блізарукасьці, бязьдзейнасьці і нежаданьня па-бальшавіцку працаваць. Трэба адзначыць, што некаторыя работнікі праяўляюць упартасьць і нежаданьне выпраўляць свае памылкі.

У свой час Наркамфінам быў накіраваны пракуратуры рэспублікі матар'ял аб расьсьледваньні і прыцягненьні да адказнасьці службовых асоб з Пухавіцкага раёну, вінаватых у скажэньні клясавай лініі: да 1931 году ні раённыя арганізацыі, ні сельсаветы не абкладалі індывідуальна яўна кулацкія гаспадаркі, якія нават пасьля рэвалюцыі да 1926 году захавалі ад 200 да 400 гэкт. зямлі (Антановіч, Татур, Выліна, Дамброўскі — Талькаўскага сельсавету).

Прамарынаваўшы гэтую справу на працягу трох месяцаў, пракуратура, нарэшце, «соизволила» паведаміць: «У 1931 годзе ўвесь склад сельсавету вымяніўся, адказныя работнікі райвыканкому таксама зьмяніліся, са старых работнікаў застаўся там толькі адзін намесьнік старшыні райвыканкому. Лічу, што да крымінальнай адказнасьці прыцягваць няма каго».

Камэнтары, здаецца, непатрэбны.

***

Такое становішча надалей нецярпіма. Трэба навесьці рашучую і бязьлітасную барацьбу в усякага роду скажэньнямі лініі партыі пры правядзеньні с.-г. падатку. Раённыя арганізацыі і сельсаветы павінны неадкладна выправіць дапушчаныя памылкі, уцягнуўшы ў гэту работу шырокую працоўную грамадзкасьць.

М. МАРТ.

Лесаснабзбыт зрывае работу лазень

Менскія лазьні не забясьпечваюцца апалам

Мы праводзім паход за чыстату, змагаемся з брудам і антысанітарыяй, дамагаемся выкананьня элементарных культурна-гігіенічных звычаяў і санітарнага мінімуму. Для гэтага патрэбна шырока разгарнуць сетку культурна-бытавых устаноў, забясьпечыць іх бесьперабойную работу.

Між тым працоўнае насельніцтва Менску ўжо шмат часу пазбаўлена магчымасьці карыстацца пральняй і лазьнямі. Апошніх у Менску зусім мала (усяго 3 на ўвесь горад), дый тыя надавычай рэдка працуюць, в прычыны недахвату апалу.

Для бесьперабойнай работы меншых лазень на працягу паўгода патрэбна 13.500 кбм. дроў. Лесаснабзбыт, ад якога залежыць забясьпячэньне дрывамі, скараціў заяўку Абкамтрэсту да 11.000 кбм., а зараз зрывае дастаўку і гэтай колькасьці. За ліпень і жнівень замест патрэбных 4.000 кбм. было дастаўлена ўсяго 1.200.

Галавацяны з Лесаснабзбыту дадумаліся прымацаваць Абкамтрэст да... Бабруйскага леспрамгасу, які забясьпечвае апалам таксама хлебазавод, Эльвод і іншых 30, усталёў, паміж якімі заўсёды ідуць спрэчкі аб тым, каму раней атрымаць апал. Дровы для лазень і пралень грузяцца ў Менск фактычна ў апошнюю чаргу.

Значная частка віны за прастой лазень кладзецца і на Абкамтрэст. Можна было наладзіць рэгулярную здабычу торфу на адлетласьці за некалькі кілёмэтраў ад Менску і дастаўку яго ў горад на апальваньне лазень і пралень з прымешкай пэўнага процанту дроў.

Лесаснабзбыт павінен наладзіць бесьперабойнае забясьпячэньне дрывамі.

Абкамтрэст абавязан абсталяваць патрэбны транспарт і арганізаваць вывазку торфу для апальваньня лазень.

Лазьні і пральні павінны ў далейшым працаваць штодзенна і бесьперапынна.

Недапушчальныя перагібы

ГОРКІ. (Наш кар.). На КЛЕДНЯВІЦКІМ сельсавеце, з-за адсутнасьці масава-растлумачальнай работы, пазыка рэалізуецца вельмі дрэнна. Старшыня сельсавету, Хахлоў, каб нагнаць упушчанае і выканаць заданьне, ужывае меры прымусовага навязваньня аблігацый. Нядаўна ён заявіў члену калгасу «Чырвоная зорка»—Гаўрыле Арлоўскаму: «Калі ты заўтра ня возьмеш аблігацый на 100 руб., дык цябе выкінуць з калгасу».

Трэба заклікаць да парадку перагібшчыка, які падмяняе агітацыйна-растлумачальную работу адміністрацыйным націскам.

І-а.

Год выдання—XV
№ 250 (4155)
Панядзелак 14 верасьня 1931
Цана нумара 5 кап.
ВЫХОДЗІЦЬ БЕСЬПЕРАПЫННА

Зьвязда

Орган ЦК Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

РЭДАКЦЫЯ І КАНТОРА
МЕНСК, САВЕЦКАЯ, 63.
Тэлефоны
рэдактар—4-27, сакратар—19-14, партсакратар—13-50, гарэкам.—13-80, сек. заход.—6-19, мясц. інфарм.—6-19, замеж. інфарм.—6-19, пашы рэдактар—6-42, мікрарэдакт. інфармацыі—10-74, сапраўдчык—161, аддз. абвестак—7-51

АБВАСТРЭНЬНЕ „ПАЦЫФІКАЦЫІ“ НА ЗАХ. УКРАІНЕ

Створаны спэцыяльны дэпартамент для пабудовы шыбеніц

Арыштаваным левым пісьменьнікам пагражае кара сьмерцю

Масавыя арышты ў Заходняй Украіне

ВАРШАВА, 12. Пагрозы крывавай расправы над украінскімі працоўнымі масамі, якія ня выходзілі са стэронак фашысцкага друку пасьля забойства натхніцеля і арганізатара «пацыфікацыі» Зах. Украіны і Зах. Беларусі вядомага Тадэўша Галуўка, пачынаюць рэалізавацца.

Фашысты зьверска помсьцяцца. Пад шыльдай шуканьня забойцаў Галуўкі па ўсёй Заходняй Украіне праводзяцца масавыя аблавы і арышты,—пачалася фактычна новая крывавая «пацыфікацыя».

«Газэта Варшавска» ад 11 верасьня паведамляе аб тым, што ў СТАРЫХ КУПРОВІЧАХ арыштаваны вучань украінскай гімназіі СТАХОВІЧ. У КАМАРНЕ арыштавана 11 асоб: браты А. і О. ПЭРАНЫ, СТУДЭНТЫ—РАДОВІЧ, ЛЕНЬЦА, ЛІШЧЭНСКІ, СЭНЮТА, САРАКОЎСКІ, КОГУТ, УКРАІНСКІ КААПЭРАТАР—РАДОВІЧ, ВУЧНІ ГІМНАЗІІ—ДРЫМАЛЫКА І КАЛЫМОН.

У БАБРОЎЦЫ паліцыя таксама правяла рад вобыскаў і арыштавала работнікаў «Прасьветы» КАЦЮНБАСА, ПАНКЕВІЧА, БОДНАРА, МІХАЛКЕВІЧА, РУДНАГА, ВАСЫЛЫКА, і І. В. ГАРБУСЭВІЧАЎ.

У САМБОРСКІМ ПАВЕЦЕ арыштаваны студэнт В. СТУПНІЦКІ. У ЛЮТАВІСКАХ арыштаваны БАЦЬКА І СЫН СІЛЕЦКІЯ. У БАРЫСЛАЎЛІ — студэнты ПАДГУРЭЦКІ І ТУРАШ, а таксама служачыя ГУРКОЎ, НІКЛЕВІЧ І ПАДГАРЭЦКІ.

Вялікія арышты адбыліся ў МІРАЖНІЦЫ і ГОВІЧЫ. Сярод арыштаваных—пераважна студэнты-украінцы. Ёсьць жанчыны. Усіх арыштаваных абвінавачваюць у прыналежнасьці да тэрарыстычнай украінскай арганізацыі. АРЫШТАВАНЫЯ ПАСАДЖАНЫ Ў БАРЫСЛАЎСКУЮ ТУРМУ.

Для вядзеньня сьледзтва на Заходняй Украіне прыслан судзьдзя—сьледчы для спраў надзвычайнай важнасьці СКАРЖЫНСКІ.

Арыштаваныя левыя пісьменьнікі аддаюцца ваенна-палявому суду

ВАРШАВА, 13. Сёньнішнія варшаўскія газэты перапоўнены паведамленьнямі «аб надзвычайным посьпеху» паліцыі, якая сумела пралезьці ў «сапы цэнтр камунізму» і арыштаваць групу вядомых усёй Варшаве левых польскіх літаратараў, з якіх адзін зьяўляецца адказным рэдактарам легальнага літаратурна га штомесячніка, а другі—сакратаром ня менш легальнага штотыднёвіка «Вядомосьці літарацкіе». Газэта «Вечар варшаўскі» сьцьвярджае, што ГРУПА АРЫШТАВАНЫХ ЛЕВЫХ ЛІТАРАТАРАЎ БУДЗЕ ПЕРАДАНА ПАЛЯВОМУ СУДУ. (ТАСС).

Фашысцкі тэрор ўзмацняецца

Гялікі палітычны працэс у Явожне

ВАРШАВА, 13. Коціцца хваля вобыскаў і арыштаў па ўсёй Польшчы. За апошнія два-тры дні фашысцкая і сацыял-фашысцкая прэса перапоўнена паведамленьнямі аб палітычных працэсах і аб масавых арыштах.

«Газэта Польска»—афіцыёз фашысцкага ўраду—ад 11 верасьня паведамляе аб масавых аблавах і арыштах у Варшаве, якія адбыліся ўвесь дзень 10 верасьня. Арыштавана некалькі дзесяткаў рабочых па абвінавачваньні нібы ў прыналежнасьці да дружын пралетарскай самаабароны. Апрача таго арыштаваны і пасаджаны ў турму 7 рабочых-пекароў, якіх абвінавачваюць у прыналежнасьці да нелегальнага прафсаюзу пекароў. Аблавы, рэйды і арышты працягваюцца і далей.

«Слово» і «Дзеньнік Віленскі» ад 12 верасьня падаюць аб арыштах, праведзеных паліцыяй у Вільні сярод рабочых гуты «Вітрыум». Арыштавана і пасаджана на Лукішкі 6 рабочых: Купша, Краўчынскі, Келмуць і інш. Арыштаваных абвінавачваюць у тым, што яны праводзілі сярод рабочых нібы камуністычную агітацыю, распаўсюджвалі адозву ліквідаванага фашысцкімі ўладамі рэвалюцыйнага прафсаюзу рабочых шкляной прамысловасьці і што яны нібы ўваходзілі ў склад рэвалюцыйнага фабрычнага камітэту.

«Беларуская крыніца»—орган беларускіх хадэкаў (хрысьціянскіх дэмакратаў)—ад 10 верасьня паведамляе, што 23 жніўня сярод вучняў ліквідаванай клецкай беларускай гімназіі праведзены рэвізіі і арышты.

Сацыял-фашысцкі «Роботнік» ад 11 верасьня піша аб тым, што ў кракаўскім акруговым судзе пачаўся вялікі палітычны працэс над 21 рабочымі-гарнякамі. Гэты працэс—водгук вядомых падзей у Явожне 19 мая 1931 году. Як вядома, у радзе капалень Явожня выбухнулі магутныя забастоўкі гарнякоў супроць увядзеньня новых умоў працы і паніжэньня зарплаты. Калі паліцыя пачала разганяць дэманстрацыю бастуючых—яны адказалі градам каменьняў, стыхійна наўсталі барыкады. Заклепелі барыкадныя баі, якія ўдалося ліквідаваць толькі пры дапамозе значных атрадаў паліцыі, выкліканых з Кракава. За час баёў 5 рабочых былі забітыя, шмат паранена, а таксама было парэпена 9 паліцэйскіх.

Гарнякі абвінавачваюцца ў прыналежнасьці актыўнага ўдзелу ў разрухах, што зараз караецца сьмерцю.

Працэс прыцягвае да сябе вялікую ўвагу рабочых гарнякоў і ўсіх працоўных Польшчы. Працягнецца ён некалькі дзён.

Добрыя парады замест крэдытаў

ВАРШАВА, 11.

У польскай прэсе ад 11 верасьня надрукавана выдатная гутарка польскага паўафіцыёзнага агэнцтва «Іскра» з французкім міністрам фінансаў Фляндэнам.

Фляндэн заявіў, што ён «незьмерна задаволены, бачачы, што Польшча натропку пераможна выходзіць з крызісу». На працягу апошніх месяцаў ня было моманту, калі-б ён, Фляндэн, непакоўся за стан польскай валюты.

— З усяго гэтага вынікае, — заўляе Фляндэн,—адзін урок: Польшча можа вытрымаць крызіс да канца толькі тады, калі будзе цьвёрда весьці палітыку захаваньня бюджэтнай роўнавагі. Нікай насельніцтва Польшчы зразумее, што ахвяры ў імя захаваньня роўнавагі бюджэту неабходны. Польшча пераможа крызіс без дапамогі замежніцы.

— Крэдыт,—павучае далей Фляндэн,—гэта—функцыя давер'я. Давер'е-ж ствараецца на аснове голых фактаў. Сьвету неабходны факт перамогі Польшчы ў галіне фінансаў. Да гэтага можна прысьці толькі шляхам вялікіх ахвяр з боку ўсяго насельніцтва і польскі ўрад павінен патрабаваць гэтых ахвяр і падалей, бо нельга прадбачыць ці будзе на працягу бліжэйшай зімы палепшэньне гаспадарчай кан'юнктуры ў Эўропе.

Пасьля французкіх запэўненьняў на банкеце з Залескім, што Францыя захоўвае традыцыі Кольбэра гатовага, каб дапамагчы Польшчы «зэлажыць яйчак і дзяцей», выступленьне французкага міністра фінансаў, які падкрэсьліў, што Польшча ня можа разьлічваць на французкае золата, зрабіла ў польскіх гаспадарчых колах уражэньне халоднага душу. Ініцыятыва «Іскры», якая стараліся зьмясьціць інтэрв'ю з Фляндэнам «для падмацаваньня сэрцаў» прывяла да сэнсацыйнага і надзвычай прыкрага непаразуменьня.

Свавольле польскай паліцэйшчыны ня мае граніц

Увядзеньне ваенна-палявых судоў у фашысцкай Польшчы яшчэ больш разьвязвае рукі дэфэнзыве і паліцэйшчыне ў іх крывавай расправе над рэвалюцыйнымі рабочымі і сялянамі. Ужо раней, да ўвядзеньня гэтай надзвычайнай меры барацьбы з рэвалюцыйным рухам, —разьюшаная паліцэйшчына і дэфэнзыва вельмі часта арыштаванага рабочага або селяніна бяз суда расстрэльвала па дарозе ў паліцэйскі пастарунак, тлумачачы свой учынак «уцёканьнем» арыштаванага. Увядзеньне Сталыпінскай сыстэмы дае поўны прастор іх свавольля—распраўляцца над арыштаванымі рэвалюцыйнымі рабочымі і сялянамі. Яшчэ толькі ўчора на старонках «Зьвязды» мы зазначалі, што досыць будзе даносу якога-небудзь сышчыка або паліцэйскага, каб на падставе ваенна-палявога суда павіс на шыбеніцы кожны «непажаданы» для фашысцкай дыктатуры рабочы або селянін, як ужо сёньня орган польскіх сацыял-фашыстаў «Роботнік» у № 321 ад 10 верасьня падае наступны факт:

«Пару дзён таму назад з фальварку Гладчыцы у Пултуск вечарам вяртаўся на вэлісыпэдзе інструктар пэпэсэўскага прафсаюзу с.-г. рабочых Сосьніцкі. Па дарозе сустрэлі яго 4 паліцэйскіх і сышчык, спынілі яго, скамандвалі «рукі ўверх», забралі ад яго ўсе дакументы, прыкладамі зьбілі да крыві, закавалі ў ланцугі і накіравалі ў Пултуск.

У арыштным доме пры пастарунку па ліцыі яго пратрымалі 36 гадзін і толькі пасьля гэтага ён даведаўся ў чым абвінавачваецца—а іменна, у бандыцкім нападзе на праяжджаўшых па шасэ братоў Плоткаў з мэтай грабяжу».

Зразумела, судзьдзя сьледчы ўбачыў, што здарылася памылка, што папаўся свой-жа брат сацыял-фашыст і адразу-ж звольніў яго.

Сацыял-фашыскі «Роботнік» «абураецца» гэтым фактам і ўсяляк раздувае яго, каб паказаць перад масамі, што ён «абараняе» іх інтарэсы, каб мець магчымасьць яшчэ лепш дапамагаць фашысцкай дыктатуры душыць рэвалюцыйны рух. Калі ў фашысцкай Польшчы кожны дзень адбываюцца тысячы такіх выпадкаў самавольнай расправы над працоўнымі масамі, калі адбываецца крывавая «пацыфікацыя» Зах. Украіны і Зах. Беларусі, а зараз уведзены ваенна-палявыя суды для масавага, адкрытага зьнішчэньня рэвалюцыянэраў, — дык фашысцкія сацыял-прахвосты маўчаць. Больш таго, яны яшчэ дапамагаюць крывавай фашысцкай дыктатуры распраўляцца над гэтымі масамі.

Фашысцкі служка, арыштаваны памылкова па абвінавачваньні ў нападзе, быў зараз-жа зволены судзьдзёю. Зусім наадварот было-б, каб пры такіх-жа ўмовах папаўся рабочы або селянін, а чаго добрага, яшчэ падазроны ў рэвалюцыйнай дзейнасьці. Калі ён ня быў-бы адразу-ж закатаваны разьюшанай паліцэйскай бандай, дык на падставе ваенна-палявога суда праз 24 гадзіны ні ў чым не павінны вісеў-бы на шыбеніцы, або быў-бы расстрэлен. Паліцэйская банда і дэфэнзыва пастараліся-б «здабыць» довады.

Напэўна, што сац.-фашысты не зьмясьцілі-б пават і храпікёрскай заметкі пра гэта.

Віленскія каты рыхтуюцца

ВІЛЬНЯ, 12. Як паведамляе «Дзеньнік віленскі» ад 12 верасьня старшыня віленскага акруговага суда вылучыў ужо ваенна-палявы суд. У склад ваенна-палявога суда ўвяходзяць наступныя судзьдзі: Я. Занеўскі—вядомы сваімі дра конаўскімі прысудамі (старшыня суда), С. Мілашэвіч і М. Шпакоўскі (члены суда). Іх намесьнікі—Э. Гура, Ч. Сянькевіч і В. Скіндэр.

Каты рыхтуюцца да крывавых расправ над рэвалюцыйнымі рабочымі і сялянамі.

Эпідэмія самагубстваў у Варшаве

Кожны нумар польскай буржуазнай прэсы стракаціць весткамі аб бядодмных людзях, якія запаўняюць вуліцы Варшавы, аб трагедыях на грунце беспрацоўя, аб эпідэміі самагубстваў.

Так, сацыял-фашысцкі «Роботнік» ад 10-га верасьня паведамляе аб жудасным становішчы 11 бядодмных сем'яў у Варшаве. Гэтыя сем'і жылі даволі доўгі час у магістрацкіх бараках для бядодмных. Але пасьля таго, як бацькі і мужы былі назбаўлены працы і не маглі заплаціць за пражываньне ў бараках, былі выселены на двор, пад адкрытае неба. І вось зараз ужо некалькі месяцаў жывуць гэтыя сем'і разам з малымі дзецьмі на дварэ, пад адкрытым небам, пад дажджом, ніхто імі і ня цікавіцца. Зразумела, што гэта толькі кропля ў моры, бо такіх сем'яў палічваецца ў адной толькі Варшаве дзесяткі тысяч.

Нічога дзіўнага няма ў тым, што слабейшыя з іх канчаюць сваё гарапашнае жыцьцё самагубствам.

Той-жа «Роботнік» ад 8-га верасьня гаворыць аб самагубстве работніц Яніны Шафлярскай і Зосі Задрапавай у Кракаве. Прычына самагубства — голад.

На наступнай старонцы чытаем зноў, што 22-хгадовы Ян Андрэеўскі — варшаўскі беспрацоўны, наніўся воцатнай эсэнцыі. Прычына самагубства — адсутнасьць сродкаў да жыцьця.

«Газэта Варшаўска» ад 8-га верасьня піша аб эпідэміі самагубстваў у Варшаве. За адзін дзень атруціўся газам банкаўскі служачы, 32-хгадовы Шантыр, 50-цігадовая жанчына невядомага прозьвішча напілася ёду, а другая жанчына 45 год атруцілася дэнатуратам.

«Дзеньнік Віленскі» ад 8-га верасьня паведамляе аб тым, што павесіўся селянін Язэп Козар з вёскі Забеліцкі, Дзевянінскай гміны, Ашмянскага павету. Прычына самагубства — сэквэстратар за падаткі забраў апошняга каня. Факты самагубства на вёсцы — найбачнае дагэтуль зьявішча — павялічваюцца па меры ўзмацненьня падатковага націску.

— Сьпіс дакладчыкаў, вылучаных для правядзеньня растлумачальнай работы на прадпрыемствах г. Менску па пытаньнях супроць паветранай абароны: Патчанка (Камвуз)—заў. «Беларусь», Паскевіч (Камвуз)—ф-ка «Камунарка», Браніштэйн (Камвуз) — Мясакамбінат, Азарэнч (Камвуз)—шчотачная ф-ка, Райгарэнка (Камвуз)—ф-ка імя 3 сакавіка, Табакоў (Камвуз)—Хлебазавод, Гаталюк (Камвуз)—База Менбуду, Пасюк (Камвуз)—«Чырв. Зорка», Аўсеенка (Камвуз)—шпалерная ф-ка, Стральноў (Камвуз)—пошта, Фудадзеў (Камвуз)—Дзяржбанк, Юхно (Камвуз)—Мен. адд. Белдзяржснабу, Налубінскі (Камвуз)—дражджавы зав., Гапоненка (Камвуз)—зав. «Ударнік», Калтоўскі (Камвуз)—скарняжная ф-ка, Шук (Камвуз)—чыгунка Цягі, Лысенка (Камвуз)—чыг. эксплёат., Барысевіч (Камвуз)—чыг. шляху, Будаеў (Камвуз)—Малочны зав., Дуля (Камвуз)—Палата мер і вагі, Каралькоў (Камвуз)—Самтрамсаюз, Макараў (Камвуз)—Самтрамсаюз, Мялешка (Камвуз)—друк. імя Сталіна, Славін (Камвуз)—ф-ка «Беларуская», Пяткевіч (Камвуз)—БКС, Южылка (Камвуз)—гута «Пралетары», Пабітка (ГК КП(б)Б) —зав. імя Варашылава, Шот (ГК КП(б))—ф-ка імя Крупскай, Фурсаў (Гар. КК)—ф-ка «Кастрычнік», Кулінёнка (Гар. КК)—зав. «Бальшавік», Назасёлаў (АСО)—«Чырв. Тэкстыльшч.», Хачава (АСО)—Фармазавод, Даўнэс (АСО) —Эльвод, Худыш (ГК ЛКСМ) — Транспартгрэст, Астроўскі (ВОХР)—«ДА», Янкович (ГК ЛКСМ)—абутковая ф-ка. Інструкцыйны сход дакладчыкаў па пытаньні манэўраў супроць паветранай абароны адбудзецца 14 верасьня, у 18 гадз., у залі Гарэкому КП(б)Б.

— 14-га верасьня, у 7 гадз. вечара, у Доме Камасьветы, пакой № 19 склікаецца нарада ўсіх прапагандыстаў, вылучаных ячэйкамі для прапаган. працы сумесна з культпропамі, парткалектывамі і яч.

— 20 верасьня, у 6 гадз. веч., у пакоі 422 аддзелу ЦК КП(б)Б адбудзецца пасяджэньне прыймовай камісіі ЦК КП(б)Б, на якое павінны зьявіцца наступныя т. т.: Пэўляк В. Л. (Лельчыцкі р-н, старшыня калгасу), Лапін В. Л. (Гомель), Ягораў І. І. (Менск). Праезд за свой кошт.

Папраўка

У «Зьвязьдзе» за 7 верасьня ў пастанове Савету Народных Камісараў БССР аб ходзе ўборачнай і пасэўнай кампаніі ўкралася памылка наступнага зьместу: напісана «Збожжавых культур па становішчы не 1-IX 1931 г., а па тэхнічных культурах—да 1-IX 1931 г. і падаць у НКЗБ», а трэба: «па становішчы на 15-IX 1931 г., а па тэхнічных культурах да 1-IX 1931 г.» і г. д.

„НАША БАЦЬКАЎШЧЫНА—САВЕЦКІ САЮЗ

на крывавы тэрор фашысцкай зграі--мы адказваем бальшавіцкай асеньняй сяўбой, чырвонымі абозамі“

—заяўляюць калгасьнікі-палякі калгасу „Чырвоны Штандар“

ДА ЎСІХ КАЛГАСЬНІКАЎ БССР

Ударная брыгада сусьветнага пралетарыяту—рабочыя, калгасьнікі, беднякі і сераднякі—аднаасобнікі Савецкага Саюзу шляхамі тэмпамі будуюць сацыялізм на адной шостай зямной кулі. Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі мы ўдарнымі тэмпамі перабудоўваем нашу краіну—бацькаўшчыну сусьветнага пралетарыяту.

Мы будуем фабрыкі і заводы, руйнуем межы аднаасобнай сялянскай гаспадаркі шырокай хвалёй калектывізацыі, якая зьнішчае ў нас апошнюю клясу эксплёататараў—кулацтва.

Кожную хвіліну нашай работы мы аддаем барацьбе за пяцігодку за 4 гады, за праграму трэцяга рашаючага году пяцігодкі, у якім пабудуем фундамант сацыялізму ў нашай краіне.

Праз тысячы перашкод, праз напружаную барацьбу з кулацтвам і яго агентамі—правымі і «левымі» апартуністамі, мы ідзем да рашаючых перамог у барацьбе за сацыялізм.

У нашай працы мы кожную хвіліну памятаем, што па той бок мяжы крызіс выкідвае на вуліцу мільёны працоўных, закрывае фабрыкі і заводы, асуджае на галодную сьмерць мільёны рабочых і сялян.

Кожную хвіліну мы памятаем аб тых, хто ў фашысцкай Польшчы, Зах. Беларусі і Зах. Украіне ўздымае чырвоныя сьцягі супроць крывавага ўраду фашысцкай дыктатуры, ураду тэрору і падрыхтоўкі ўзброенага нападу на СССР.

Справа барацьбітоў за Савецкую Польшчу, — наша справа.

МЫ НІ НА ХВІЛІНУ НЕ ЗАБУДЗЕМ ТЫХ, ХТО КІНУТ ФАШЫСЦКІМ УРАДАМ Ў ЗАСЬЦЕНКІ ЛУЦКУ, ВРОНАК, ЛУКІШАК, ВІЛЬНІ, БЕЛАСТОКУ І ІНШ.

Мы заўсёды памятаем гераічных барацьбітоў за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленьне—палітзьняволеных Польшчы, Зах. Беларусі і Украіны.

НАШ КАЛГАС «ЧЫРВОНЫ ШТАНДАРТ», ПЛЕШЧАНІЦКАГА РАЁНУ, ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА ПОЛЬСКІМ НАЦЫЯНАЛЬНЫМ КАЛГАСАМ І ЯДНАЕ Ў СЯБЕ 60 ГАСПАДАРАК.

У КРАІНЕ САВЕТАЎ МЫ ЗНАЙШЛІ СВАЮ БАЦЬКАЎШЧЫНУ, ЯКАЯ ДАЛА НАМ ПРАВЫ ПРАЦОЎНЫХ УСЯГО САВЕЦКАГА САЮЗУ, МЫ МАЕМ НАШУ ПОЛЬСКУЮ ШКОЛУ, ДЗЕ З НАШЫХ ДЗЯЦЕЙ ВЫХОЎВАЕЦЦА НОВАЕ ПАКАЛЕНЬНЕ БАРАЦЬБІТОЎ ЗА САЦЫЯЛІЗМ.

У ФАШЫСЦКАЙ ПОЛЬШЧЫ ДЛЯ НАС НЯМА БАЦЬКАЎШЧЫНЫ. У ФАШЫСЦКАЙ ПОЛЬШЧЫ ЗАБАРОНЕНЫ БЕЛАРУСКІЯ І УКРАІНСКІЯ ШКОЛЫ.

ТЫСЯЧЫ ЛЕПШЫХ РАБОЧЫХ І СЯЛЯН ЗАХ. УКРАІНЫ І ЗАХ. БЕЛАРУСІ КІНУТЫ Ў ТУРМЫ ЗА БАРАЦЬБУ ЗА ВЫЗВАЛЕНЬНЕ ПРАЦОЎНЫХ СВАЕЙ КРАІНЫ.

Мы з вялікім абурэньнем ганьбім і рашуча пратэстуем супроць новага закону фашысцкай дыктатуры аб прыраўнаньні палітзьняволеных да крымінальных злачынцаў, закону, які асуджае 10.000 гераічных палоннікаў капіталу Польшчы, Зах. Беларусі і Украіны на нячуваныя зьдзекі, катаваньні, якіх ня ўжывэў і былы царскі ўрад, на фізічнае зьнішчэньне лепшых прадстаўнікоў рабочай клясы і працоўнага сялянства. МЫ ПРАТЭСТУЕМ СУПРОЦЬ УВЯДЗЕНЬНЯ ВАЕННА-ПАЛЯВЫХ СУДОЎ.

Мы аднадушна ганьбім сярэдня-ліквых інвэзітараў польскіх фашыстаў і ў адказ польскім Сталыпіным—МЫ КАЛГАСЬНІКІ «ЧЫРВОНАГА ШТАНДАРТУ» БЯРЭМ НА СЯБЕ НАСТУПНЫЯ АБАВЯЗКІ ПА ДАПАМОЗЕ НАШЫМ БРАТОМ ПА КЛЯСЕ.

1. Усе як адзін уступаем у рады МОПР'у.

2. Выходзім на нядзельнік дапамогі палітзьняволеным Польшчы, Зах. Беларусі і Зах. Украіны.

3. Абавязваемся здаць чырвонымі абозамі ўсе таварныя пішкі дзяржаве і поўнасьцю выканаць плян загатовак.

4. Па-бальшавіцку правесьці асеннюю сяўбу і засеяць 1 гэкт. звыш пляну у фонд МОПР'у.

Мы дапучаемся да закліку рабочых Менскага чырвонасьцяжнага заводу «Бальшавік» аб прыезьдзе рабоча-сялянскай дэлегацыі Польшчы ў Савецкую Беларусь.

Няхай грыміць на ўвесь сьвет грозны пратэст калгасьнікаў Савецкай Беларусі супроць фашысцкага тэрору ў Польшчы.

Рукі прэч ад палітзьняволеных!

Няхай жыве Камінтэрн—штаб сусьветнай рэвалюцыі!

Ад імя агульнага сходу калгасу «Чырвоны штандар»: КРАСОЎСКІ, ПІЛІПЕНКА, БЕЛЯКОВІЧ, САДКОЎСКІ, БАБРОВІЧ, БАБСКІ, ЖУК І ПРАТАСЕНАК.

Фашысцкая Польшча на шляху да катастрофы

Ня гледзячы на афіцыяльныя запэўненьні кіраўнікоў фашысцкай дыктатуры аб тым, што Польшча выходзіць ужо з паласы жорсткага эканамічнага крызісу, ня гледзячы на салодкія песенкі аб «благадушным», што так патрэбны фашысцкім заправілам для ўтаемаваньня грамадзкай думкі заграніцай, каб як-небудзь атрымаць новыя кредыты на падрыхтоўку інтэрвэнцыі супроць СССР, на павялічэньне і без таго вялікага апарату тэрору, які асабліва цяпер, пасьля ўвядзеньня ваенна-палявых судоў, патрабуе значнага ўзмацненьня,—фашысцкая Польшча шпарка коціцца ўніз, у бездань эканамічнага развалу.

Гаспадарчага развалу, які ўсё больш пагыбляецца, ня можа скрыць нават і сама фашысцкая прэса.

Кожны дзень буржуазная польская прэса стракаціць весткамі аб масавых звальненьнях рабочых, скарачэньні рабочага тыдню, аб краху прадпрыемстваў і г. д.

Сацыял-фашысцкі «Роботнік» ад 9-га верасьня падае, што вялікія прамысловыя прадпрыемствы Шэйблера і Громана ў Лодзі скарацілі дні працы з 6-5 дзён да 3 дзён у тыдзень. Прадпрыемствы фірмы «Алярт і К°» якія працавалі дагэтуль 6 дзён у тыдзень, скарацілі іх да 5 і 4.

Як дадатковы камэнтары да гэтага «Газэта Варшавска» ад 8-га верасьня піша:

«У сувязі з заканчэньнем летняга сэзону ў тэкстыльнай прамысловасьці адчуваюцца тэндэнцыі да скарачэньня вытворчасьці. З прычыны адсутнасьці заказаў і вялізарнага награмаджэньня гатовых матар'ялаў, аб'яднаныя тэкстыльныя прадпрыемствы Шэйблера і Громана закрылі ў Лодзі прадзільныя цэхі, звальняючы 250 рабочых.

Гэты-ж нумар «Газэты Варшавскай» паведамляе аб закрыцьці запасной фабрыкі ў Блоні. На запытаньне рабочых, як доўга будзе стаяць фабрыка, дырэктар адказаў:

«Фабрыка будзе стаяць да таго часу, пакуль не паставім новых машын. Можа год, можа два. Сьпяшацца ня будзем».

Лічба беспрацоўных паводле афіцыяльных даных на 5-га верасьня складала 251.547. З іх атрымлівала дапамогу 54.773. Зразумела, што лічба гэта ў сапраўднасьці значна большая.

Фашысцкі ўрад у мэтах зьвядзеньня канцоў з канцамі, скарачае дапамогу беспрацоўным, скарачае пенсіі ўдовам, сіротам, інвалідам. «Роботнік» ад 9-га верасьня паведамляе аб тым, што міністэрства асьветы «з мэтай апчаднасьці» скасавала ўсе стыпэндыі і субсыдыі ў навучальных установах. Пры міністэрстве ліквідаваны дэпартамэнт культуры і мастацтва. Праводзіцца скарачэньне штату.

Але фашысцкі ўрад і словам не заікнецца аб скарачэньні бюджэту ваеннага міністэрства, ні слова аб скарачэньні выдаткаў на ўтрыманьне апарату тэрору: паліцыі, сышчыкаў і дэфэнзывы, ня думае ліквідаваць пры міністэрстве юстыцыі дэпартамэнту пабудовы шыбеніц да ўсім краі.

І так, ня гледзячы на ўсе пагрозы ў справе «запчаднасьці» за адзін толькі ліпень бюджэт фашысцкага ўраду даў 13 400.000 злотых дэфіцыту, аб чым саромна паведамляе ўрадавы орган «Газэта польска» ад 9-га верасьня.

Крызіс балюча ўдарыў па насельніцтве. Галеча расьце. Зьмяншаюцца з кожным месяцам ўклады ў банках. Так «Роботнік» ад 9-га верасьня піша, што паводле ўрадавай статыстыкі на працягу 4-х месяцаў (сакавік-ліпень) па адных толькі вялікіх польскіх банках ўклады зьменшыліся на 158.000.000 злотых. Гэты факт сьведчыць аб усеагульным зьбядненьні насельніцтва, якое зьялае свае зьбераженьні, а таксама аб недавер'і ўраду, ураду голаду, тэрору і падрыхтоўкі вайны.

Ня гледзячы на моцнае заціскальне падатковай трубы, на мабілізацыю ўсяго падатковага апарату, падатковая запазычанасьць бязупынна расьце. Сацыял-фашысцкі «Роботнік» ад 8 верасьня паведамляе, што на 31 сакавіка 1931 году падатковая запазычанасьць раўнялася вялізарнай лічбе—мільярду злотых. Цяпер гэта лічба, зразумела, павялічылася яшчэ больш. Якія-б драконаўскія меры ня ўжываў фашысцкі ўрад, яму ўсё-ж пры цяперашняй эканамічнай сітуацыі ня ўдасца выціснуць з шырокіх мас такой сумы. Нязгодкі катастрафічным зьяўляецца гаспадарчае становішча Польшчы, сьведчыць той факт, што ўрад мае намер прыступіць да новага скарачэньня пэнсіі дзяржаўным служачым.

Такім чынам, усе запэўненьні аб тым, што фашысцкіх кіраўнікоў аб выхадзе Польшчы з паласы крызісу зьяўляюцца хлусьнёй чысьцейшай вады. Польшча ў сапраўднасьці, што раз глыбей і глыбей, скочваецца ў бездань гаспадарчага развалу.

Т.

Адказны рэдактар С. БУДЗІНСКІ.

Правілы

прыёму ва Усебеларускую Саўпартшколу II-й ступ. імя т. Варашылава ў Магілеве на 1932 год (ЗІМОВЫ НАБОР)

1. Усебеларуская Саўпартшкола складаецца з 2-х аддзяленьняў, з якіх адно рыхтуе працаўнікоў прыгарадных садова-гародных калгасаў і саўгасаў (партработнікаў, палітасьветработнікаў), другое — прапагандыстаў для чытачнага і воднага транспарту.

2. На калгаснае аддзяленьне прымаюцца рабочыя і калгасьнікі, члены партыі са стажам ня менш 2-х год і члены ЛКСМ з вытворчым рабочым або батрацкім стажам ня менш 3-х год і камсамольскім стажам ня менш 4-х год.

УВАГА: Лік прынятых камсамольцаў (ня членаў партыі) складае ня больш 10 процантаў агульнага ліку прынятых.

3. На транспартна - прапагандысцкае аддзяленьне прымаюцца рабочыя і калгасьнікі — выключна члены партыі з 2-хгадовым стажам, члены КСМ з 3-х-гадовым стажам прымаюцца пры наяўнасьці 1-гадовага партстажу.

УВАГА: Ад таварышоў, паступаючых за Ўсебеларускую Саўпартшколу, патрабуецца 2-гадовы стаж практычнай грамадзкай працы, прычым на транспартна-прапагандысцкае аддзяленьне ў першую чаргу прымаюцца т. т., якія маюць стаж прапагандысцкай работы.

4. Т. т., паступаючыя ў Саўпартшколу, павінны ўмець добра чытаць і пісаць, пісьмова выкладаць свае думкі, добра ведаць 4 дзеяньні арытмэтыкі над цэлымі лічбамі і мець агульна-палітычную падрыхтоўку ня ніжэй 2-гакіраваны ў Саўпартшколу.

5. Адбор курсантаў у Саўпартшколу праводзіцца камісіямі, утворанымі пры гаркомах і райкомах КП(б)Б. Сваю працу камісіі павінны закончыць да 15-га лістапада 1931 г., каб усе матар'ялы па камплектаваньні былі зараз-жа накіраваны ў Саўпартшколу.

6. Пры Саўпартшколе ўтвараецца мандатная камісія ў складзе загадчыка школы, загадчыка навучальнай часткі, сакратара парткалектыву школы, прадстаўніка гаркому КП(б)Б, ЛКСМВ.

7. Т. т., вылучаныя гаркомам і райкомам КП(б)Б для паступленьня ў Саўпартшколу, і якія прайшлі мандатную камісію пры ўсеб. СПШ, прымаюцца ў школы для праходжаньня дасаўпартшкольнай падрыхтоўкі, шляхам завочнага навучаньня, якое працягваецца з 15-га лістапада па 15-е сьнежня 1931 году.

8. Т. т., прайшоўшыя завочную падрыхтоўку, выклікаюцца на канфэрэнцыю з 20 па 25 сьнежня 1931 году, дзе канчаткова вырашаецца пытаньне аб іх залічэньні ў школу.

9. Прыймовыя іспыты для непрайшоўшых завочную падрыхтоўку адбываюцца з 20 па 25 сьнежня 1931 г. Заняткі пачынаюцца з 1-га студзеня 1932 году.

10. У Саўпартшколу не дапускаюцца хворыя заразнымі хваробамі, у тым ліку вэнэрычнымі, тубэркулёзам, яўрастэніяй ў цяжкай форме. Інвалідасьць ня можа служыць перашкодай да паступленьня ў школу, калі яна не перашкаджае разумовай працы.

11. Камандыраваныя ў Саўпартшколу забясьпечваюцца мясцовымі арганізацыямі сродкамі на праезд у абодвы канцы і сродкамі на харчаваньне ў час іспытаў ня менш, як на 5 дзён; акрамі таго, ім павінна быць выдана пэнсія за адзін месяц уперад, на падставе пастановы Наркампрацы № 29 за 1930 г.

12. Камандыроўка ад мясцовых парт-арганізацый не гарантуе прыёму ў школу. Канчатковае вырашэньне прыёму ўскладаецца на мандатную камісію пры СПШ. Ня прынятыя ў школу вяртаюцца назад, за імі захоўваюцца займаныя імі раней пасады.

13. Школа прадастаўляе курсантам інтэрнат, пасьцельныя прылады, харчаваньне, патрэбныя падручнікі і стыпэндыю. Сямейныя курсанты атрымліваюць дадатковую сямейную стыпэндыю ў залежнасьці ад ліку утрымліваемых іх матар'яльнай забясьпечанасьці. Школа не забясьпечвае кватэрамі сем'яў курсантаў.

14. Камандыраваныя ў школу павінны мець наступныя дакументы:

а) камандыроўку ад гарокму або райкому КП(б)Б,

б) характарыстыку аб працы, дадзеную адпаведным парторгам,

в) дакументы аб ўзросьце,

г) дакументы аб адносінах да вайсковай службы,

д) засьведчаную анкету,

е) падпіску камандыраванага аб тым, што правілы паступленьня ў школу яму вядомы.

15. Агульны кантынгент зімовага набору ўстанавіць у колькасьці 150 асоб. Размеркаваньне месц па Ўсебеларускую Саўпартшколу па гаркомах і райкомах устанавіць наступнае:

Менск — 30 месц, Магілеў — 30 месц, Бабруйск — 25 месц, Ворша — 25 месц, Барысаў — 20 месц, Віцебск (чыг.) — 7 месц, Калінкавічы — 5 месц, Рагачоў — 12 месц, Шклоў — 15 месц, Юрэчаў — 7 месц, Бялынічы — 5 месц, Быхаў — 7 месц, Жлобін (чыг.) — 7 месц, Полацак — 5 месц.

Загадчык Культпропу ЦК КП(б)Б ЧАРНУШЭВІЧ
Старшыня арганізац. камісіі ВАСІЛЕВІЧ.

ЧЫРВОН. ЗОРКА Пач. 7; 8-45 і 10-30 — ЦІХІ ДОН маст. фільм у 7 частках —) ЗВЫШ